ТАТАЎ ПРЫКЛАД

Сямейная газета

АПТЫМІЗМ ЯК КАШТОЎНАСЦЬ

Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ЛЮТАГА 2022 г. ЧАЦВЕР № 22 (29644)

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«У нас ніколі не было дэфіцыту ў вытворчасці агародніны. Па некаторых пазіцыях вырошчваем у дзясяткі разоў больш, чым трэба ўнутранаму рынку, напрыклад, бульбы — у 13 разоў. У нас ёсць стабілізацыйныя фонды. Прэзідэнт летась даручыў аблвыканкамам, якія з'яўляюцца трымальнікамі стабфондаў, залажыць прадукцыю пад стапрацэнтную патрэбнасць унутранага рынку. Гэта было зроблена. Астатняе будзе адпраўляцца на экспарт».

Час і майстар

Настаўнік Лепельскай школы мастацтваў Іван БУДЗІЧ, акрамя асноў класічнага малюнка, выкладае сваім вучням і кірунак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — вучыць выразаць у дрэве барэльефы і нават скульптуры. Часта, як узор і прыклад для пераймання і натхнення, Іван Мікалаевіч паказвае сваім падапечным работы, зробленыя сваімі рукамі. У вольны ад заняткаў час настаўнік і сам шчыруе з разцом. На яго творчым стале ў невялікай хатняй майстэрні цяпер знаходзяцца выразаныя абрамленні пад гадзіннікі. Майстру застаецца толькі падагнаць акружнасці пад контуры цыферблатаў, і гадзіннікі будуць гатовыя. Шмат такіх прыгожых, з аўтарскім афармленнем гадзіннікаў цікае ў кватэрах і ў Лепелі, і ў іншых гарадах і вёсках Беларусі, і нават за мяжой.

— Я люблю ўпрыгожваць гадзіннікі выявамі птушак і жывёл, асабліва мудрымі совамі, — кажа Іван Мікалаевіч. — І наогул, час — вельмі важны сімвал, каб паспець зрабіць у жыцці добрыя справы.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- Беларусбанк накіруе Br2,3 млрд на падтрымку малога і сярэдняга бізнесу ў 2022 годзе.
- **Індыя мае намер набыць у Беларусі 1 млн т калійных угнаенняў у абход заходніх санкцый, паведамляе ТАСС са спасылкай на газету Times of India.**
- Эксперты: COVID-19 становіцца эндэмічным захворваннем.
- **На конкурсе «Містар Магілёў» выберуць самых прывабных і харызматычных. Да ўдзелу ў конкурсе арганізатары запрашаюць таленавітых маладых людзей, якія праяўляюць вялікі інтарэс да грамадскага жыцця горада.**
- Дзяржаўны доўг Злучаных Штатаў упершыню перасягнуў $30 трлн. Аб гэтым сведчаць даныя, апублікаваныя Мінфінам ЗША.

ISSN 1990 — 763X

Па палічках

У ДЗЯСЯТЫ КЛАС ГІМНАЗІІ — ПА КОНКУРСЕ

Новы Кодэкс аб адукацыі ўваходзіць у сілу з 1 верасня 2022 года. Сістэма адукацыі не стаіць на месцы і ўвесь час удасканальваецца. У новую рэдакцыю Кодэкса ўключаны змены, якія адбыліся за апошнія дзесяць гадоў. Падчас сустрэчы з журналістамі спецыялісты Міністэрства адукацыі расказалі пра асноўныя наваўвядзенні, якія з'явіліся ў дакументе, што рэгулюе дзейнасць сістэмы адукацыі ў нашай краіне.

СТАР. 13

Інвестыцыі

ПРАЕКТ З АКЦЭНТАМ НА БУДУЧЫНЮ

Укладанні бюджэту ў «Вялікі камень» ужо цалкам акупіліся

Пра гэта карэспандэнту «Звязды» расказаў кіраўнік адміністрацыі Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» Аляксандр ЯРАШЭНКА. Пра тое, чым з'яўляецца праект сёння, больш падрабязна — у нашым матэрыяле.

АБ'ЁМ ЗАЯЎЛЕНЫХ ІНВЕСТЫЦЫЙ — 1,2 МІЛЬЯРДА ДОЛАРАЎ

Суразмоўнік перакананы: гэта самы буйны і паспяховы праект ініцыятывы Кітая «Адзін пояс — адзін шлях» за мяжой.

— Праект развіваецца дастаткова дынамічна, — кажа ён. — Нягледзячы на аб'ектыўныя (у тым ліку пандэмійныя) прычыны, летась нам удалося прыцягнуць 20 рэзідэнтаў.

СТАР. 2

Абмяркоўваем Пасланне Прэзідэнта

«Нам трэба вяртацца да традыцыйных каштоўнасцяў»

Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ:

«Найперш у выступленні Прэзідэнта я звярнуў увагу на яго ацэнку сітуацыі ў свеце. Упершыню з такога высокага ўзроўню даецца вельмі прадметная і паўнавартасная ацэнка, якім чынам ажыццяўляецца перафармаціраванне сістэмы светаўладкавання. І тут я б перш за ўсё хацеў падкрэсліць з'яўленне новых відаў пагроз. Цяпер усе віды войнаў — гэта гібрыдныя, і ўсе яны рэалізоўваюцца па зусім іншых сцэнарыях. Знешні кантроль над краінай ажыццяўляецца праз перахоп дзяржаўнага кіравання. Гэта прадугледжвае стварэнне лжывых уяўленняў аб навакольнай рэальнасці. Сёння ўзброеныя сілы для захопу тэрыторый выкарыстоўваюцца рэдка. Часцей за ўсе, з ліку грамадзян пэўнай краіны фарміруецца пятая калона, кампрадорскія групы, якія пачынаюць дзейнічаць у інтарэсах знешніх цэнтраў уплывы. І такім чынам, звонку навязваецца чужая воля і прымаюцца рашэнні не ў інтарэсах уласнага народа, а ў інтарэсах якіх-небудзь замежных фінансава прамысловых груп. І гэты новы падыход сёння становіцца звычайным амаль усюды. У такіх умовах абараніць грамадства можна толькі з апорай на свае каштоўнасці.

Прэзідэнт асобна гаварыў, што каштоўнасныя арыенціры Беларусі — гэта код нацыі. Нас вельмі доўга кармілі ідэалогіямі спажывання. А сёння мы бачым, як яны разбураюцца, страчваюць сваю прывабнасць, яны па сутнасці вядуць і свет у нікуды, бо напаўняюць толькі жывот, часам пакідаючы чалавека незадаволеным. Нам трэба вяртацца да традыцыйных каштоўнасцяў, да неабходнасці духоўнага і інтэлектуальнага развіцця, да калектыўных каштоўнасцяў, да разумення, узаемападтрымкі. Гэта з'яўляецца вельмі добрай прышчэпкай супраць маніпулятыўнага роду ўмяшання спажывецкіх ідэалогій.

Вельмі важны аспект, які адзначыў Прэзідэнт, — неабходнасць кансалідаваць намаганні на ўзроўні нашых партнёраў, сяброў і саюзнікаў, з якімі ў нас падобны культурны код і агульныя каштоўнасці. Гэта неабходна, каб сумесна супрацьстаяць пагрозам.

Я хацеў бы адзначыць яшчэ адзін важны момант. Прэзідэнт гаварыў аб неабходнасці абароны нацыянальнай дзяржавы. Па ўсім свеце сёння ідзе атака на нацыянальныя дзяржавы. Іх спрабуюць выставіць гэткім бюракратычным левіяфанам, які не прыносіць карысці. Насамрэч гэта лжывы пасыл. Найперш, нацыянальная дзяржава — гэта абаронца. Так, у яго работы могуць быць выдаткі. Але менавіта нацыянальная дзяржава з'яўляецца той апорай, якая дапамагае простым людзям захоўваць і агульныя традыцыі, і агульную дзяржаўнасць.

У апошнім пытанні Прэзідэнта выявіўся яшчэ адзін важны аспект — гатоўнасць людзей актыўна, самастойна, без указкі зверху працаваць хоць бы ў інтарэсах уласных сем'яў. Але працуючы ў інтарэсах уласных сем'яў, яны будуць працаваць і ў інтарэсах усёй краіны. Гэты своеасаблівы прадпрымальніцкі дух, які будзе накіраваны на ўласную выгаду, але пры гэтым будзе ўлічваць інтарэсы грамадства, сёння вельмі неабходны. Паколькі толькі дынамічныя пасіянарныя грамадствы сёння могуць забяспечыць належны ўзровень развіцця, для таго каб супрацьстаяць тым глабальным крызісным з'явам, якія растуць сёння ў свеце. Зразумела, што і органы ўлады павінны спрыяць дасягненню дадзенай мэты.

Валерыя СЦЯЦКО.

Тры кіты беларускай мадэлі

Ірына СЦЕПАНЕНКА, старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын:

— Прыйшоў час асэнсавання падзей мінулага і сучаснасці кожным беларусам. Прыйшоў час для фарміравання перспектыў. Таму важна спытаць сябе: што ты зрабіў для сябе, грамадства і сваёй краіны?

Тры пытанні, якія паставіў кіраўнік дзяржавы ў Пасланні — гэта тры пласты адзінства інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы. На мой погляд, у гэтых пытаннях змяшчаюцца і адказы на самыя надзённыя праблемы, якія павінны хваляваць кожнага чалавека — бяспека, захаванне незалежнасці і суверэнітэту.

Галоўны пасыл для кожнага неабыякавага да лёсу сваёй краіны беларуса заключаецца ў тым, каб пакінуць пасля сябе штосьці значнае для будучых пакаленняў, не даць разбурыць гістарычную памяць. Лічу, што час дыпламатыі скончыўся. Сёння непажаданая пазіцыя пасіўнага чакання.

Важна своечасова і годна адказваць тым, хто прапануе псеўдаальтэрнатывы. Уласнай пазіцыяй адстойваць ідэалы сучаснай Беларусі. Падмуркам для гэтага стала Пасланне Прэзідэнта — па сутнасці, мадэлі развіцця краіны на найбліжэйшую перспектыву. А для нашай грамадскай арганізацыі гэта яшчэ і кірунак дзеяння, выпрацоўка новых падыходаў да работы.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ПРАЕКТ З АКЦЭНТАМ НА БУДУЧЫНЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік адміністрацыі парка лічыць такі вынік работы за мінулы год дастаткова добрым і падкрэслівае, што праект пазіцыянуцца як інтэрнацыянальны:

— Гэта міжнародная інвестыцыйная кітайска-беларуская пляцоўка, дзе практычна цалкам прадстаўлены еўрапейскі рэгіён, ёсць Злучаныя Штаты Амерыкі, Швейцарыя, Сінгапур — то-бок мы запрашаем да дзейнасці любую краіну свету, — гаворыць Аляксандр Ярашэнка.

Паводле яго слоў, галоўнае патрабаванне да рэзідэнтаў — наяўнасць высокіх тэхналогій і інавацый.

— Тое, што мы чакаем і развіваем у парку «Вялікі камень», — падкрэслівае ён.

Дык колькі ж іх сёння? Паводле слоў суразмоўніка, на дадзены момант зарэгістравана 85 рэзідэнтаў з аб'ёмам заяўленых інвестыцый больш за 1 мільярд 240 мільёнаў долараў. 37 суб'ектаў гаспадарання ўжо распачалі актыўную гаспадарчую дзейнасць па выпуску прадукцыю і аказанні паслуг. Тэрыторыя індустрыяльнага парка «Вялікі камень» на дадзены момант складае 11 761 гектараў.

— Фінансавыя вынікі яшчэ пакуль сціплыя з пункту гледжання таго, што мы знаходзімся ў пачатку свайго шляху, — кажа кіраўнік адміністрацыі, але разам з тым прыводзіць некалькі паказальных лічбаў. — У саму тэрыторыю на дадзены момант укладзена больш за 720 мільёнаў долараў.

ЗАРОБАК — ВЫШЭЙШЫ ЗА СЯРЭДНІ ПА КРАІНЕ Ў ДВА РАЗЫ

Суразмоўнік удакладняе: больш за 300 мільёнаў долараў складаюць інвестыцыі рэзідэнтаў індустрыяльнага парка. Акрамя таго, тут прысутнічае акцыянерны капітал кампаніі па развіцці парка, бюджэты дзвюх краін. Што датычыцца выдаткаў з бюджэту Рэспублікі Беларусь, яны цалкам вярнуліся, сцвярджае ён.

— Мы ўжо ўклалі ў праект 34 мільёны долараў, і для нашай невялікай краіны гэта дастаткова салідныя грошы, — акцэнтуе ўвагу Аляксандр Ярашэнка. — Але прытым, што ў нас, здавалася б, добры афшор з добрымі падатковымі льготамі, прамыя адлічэнні ў бюджэт у выглядзе падаткаў ад нашых рэзідэнтаў — кампаній парка — ужо цалкам перавысілі прамыя выдаткі бюджэту.

Пры гэтым ён звяртае ўвагу і на так званы ўскосны эфект.

— Створана больш за 1700 рабочых месцаў, пры гэтым больш за 80 % работнікаў, як правіла, беларусы, — паведамляе кіраўнік парка: — Нашы людзі працуюць на гэтых прадпрыемствах з заробкам больш за дзве тысячы 700 рублёў, што вышэй за сярэдні заробак па краіне больш чым у два разы.

Цікавая і геаграфія экспарту кампаній-рэзідэнтаў. Сёння прадукцыя пастаўляецца на экспарт у 20 краін свету, летась даход (паводле статыстыкі за дзевяць месяцаў) склаў 64 мільёны долараў.

— Выручка ў нашых рэзідэнтаў вырасла больш чым у два разы, але пры гэтым экспартная выручка (ад прадукцыі, вывезенай за межы Беларусі) вырасла больш чым у тры разы, — падкрэслівае Аляксандр Ярашэнка. — Ідзе актыўнае прасоўванне прадукцыі на экспарт, то-бок наша прадукцыя — экспартна арыентаваная. А значыць, яна якасная, карыстаецца попытам і гатовая канкурыраваць на знешніх рынках.

Працягваючы тэму эканамічнага эфекту, кіраўнік Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» упэўнены, што лічбы па чыстым прыбытку па выніках года значна палепшацца.

— Улічваючы ў цяперашні час актыўную інвестыцыйную стадыю развіцця нашага праекта (будуюцца заводы, насычаюцца абсталяваннем, выпускаецца першая прадукцыя), летась мы атрымалі станоўчы эканамічны эфект непасрэдна рэзідэнтамі, — падкрэслівае Аляксандр Ярашэнка і выказвае спадзяванні, што такі дынамічны пачатак адаб'ецца на перспектывах развіцця гэтага амбіцыйнага праекта.

РЭЗЕРВ ДЛЯ БУДУЧЫХ РЭЗІДЭНТАЎ

Расказваючы аб інфраструктуры парка, яго кіраўнік звярнуў увагу на выставачны комплекс, дзе летась праходзіла выстаўка «Белагра-2021».

— У нас ёсць што паказаць і расказаць, аб праекце можна распавядаць гадзінамі, — усміхаецца суразмоўнік. — Больш за тое, у нас з'явіўся цудоўны аб'ект — інавацыйны цэнтр, які мае форму васьмёркі і займае амаль 19 тысяч «квадратаў».

Гэта пяціпавярховы будынак з адным нулявым (пад зямлёй) і чатырма паверхамі, які будаваўся за сродкі тэхніка-эканамічнай дапамогі Кітая. У ім ёсць адмысловы дэманстрацыйны зал, у якім плануецца арганізацыя выстаўкі прадукцыі кампаній-рэзідэнтаў.

— Але самае галоўнае, дзеля чаго ён ствараўся і будаваўся, — пад новае заканадаўства для суб'ектаў інавацыйнай дзейнасці, так званыя стартапы, — тлумачыць кіраўнік адміністрацыі. — На два гады мы ім даём ільготныя перавагі, якімі карыстаюцца рэзідэнты парка, але яны пакуль не рэзідэнты. Чалавек прыходзіць з ідэяй. Мы даём месца, фінансавую падтрымку, тэхнічнае суправаджэнне і гэтак далей, ён ні за што не плаціць, аднак павінен прайсці абарону сваёй ідэі.

Паясняючы задуму такога кроку, Аляксандр Ярашэнка звяртае ўвагу, што гэта ўкладанні ў будучыню:

— Мы суправаджаем стартапы ад ідэі да камерцыйнага ўвасаблення, каб потым яны сталі нашымі рэзідэнтамі: для нас важны інавацыйны шлях развіцця.

Паводле яго слоў, летась з трох такіх стартапаў быў зарэгістраваны адзін рэзідэнт, які займаецца дакладным земляробствам.

— Праект вельмі цікавы і накіраваны на кропкавае ўнясенне ў зямлю хімікатаў і ўгнаенняў, — рэзюмуе кіраўнік адміністрацыі парка.

Вольга АНУФРЫЕВА.

У тэму

Кампетэнцыі адміністрацыі парка пашырацца

На мінулай пазачарговай сёмай сесіі Савета Рэспублікі быў разгледжаны праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

Парк створаны для прыцягнення ў нашу краіну вышэйшых тэхналогій. Для гэтага рэзідэнты парка павінны аператыўна, па месцы знаходжання ў парку атрымліваць неабходныя дазволы і іншыя дакументы, растлумачылі сутнасць прапанаваных змяненняў у Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.

У абгрунтаванні неабходнасці прыняцця змяненняў звяртаецца ўвага, што дадзены законапраект накіраваны на ўдасканаленне прававых адносін у індустрыяльным парку. Апошняе дасць магчымасць забяспечыць аператыўнасць ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур і, як вынік, палепшыць інвестыцыйны клімат.

Праектам закона пашыраецца кампетэнцыя дзяржаўнай установы «Адміністрацыя Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» у галіне выкарыстання і аховы нетраў, а таксама найменні геаграфічных аб'ектаў.

Сенатары цалкам пагадзіліся з прапанаванымі навацыямі.

Рэферэндум у лічбах: 1935 на 153

Завяршылася фарміраванне тэрытарыяльных камісій на рэспубліканскі рэферэндум

Як паведаміў БелТА старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ігар КАРПЕНКА, сфарміраваны 153 тэрытарыяльныя камісіі, на месцы ў камісіях быў конкурс. «У прыватнасці, на 153 камісіі прэтэндавалі 1935 чалавек, — сказаў Ігар Карпенка. — Не ўсе палітычныя партыі скарысталіся сваім правам вылучаць прадстаўнікоў — усяго толькі 7 партый з 15».

Працягваецца працэс вылучэння назіральнікаў на рэферэндум. Па словах Ігара Карпенкі, місія назіральнікаў ад СНД пачынае сваю работу, створаны штаб, фарміруецца поўны састаў місіі. «Мы азнаёмілі іх з ходам кампаніі па рэферэндуме, якая ідзе ў адпаведнасці з каляндарным планам. Акрамя таго, мы атрымалі інфармацыю аб накіраванні назіральнікаў у тэрытарыяльныя камісіі. Фактычна ў кожную камісію такія назіральнікі накіраваны. Але казаць выніковую лічбу будзе няправільна, таму што працэс вылучэння нацыянальных назіральнікаў будзе працягвацца. Магу сказаць, што ў Цэнтральную камісію пакуль акрэдытаваны два назіральнікі», — дадаў Ігар Карпенка.

Дарэчы

У час галасавання на рэферэндуме будуць прыняты ўсе неабходныя санэпідмеры, паведаміў старшыня Цэнтрвыбаркама Ігар Карпенка.

«Мы цяпер з Міністэрствам аховы здароўя дапрацоўваем адпаведныя рэкамендацыі. Яны будуць апублікаваны», — расказаў Ігар Карпенка.

Паводле яго слоў, на ўчастках для галасавання будуць выкананы ўсе санітарна-эпідэмічныя патрабаванні. «Мы, напрыклад, прыбралі шторкі з кабінак, каб было лепшае праветрыванне», — адзначыў старшыня ЦВК.

Паводле яго слоў, ЦВК накіравала запрашэнні прадстаўнікам ЦВК Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Туркменістана, Таджыкістана і Узбекістана. Так, ЦВК Расіі адрэагаваў і заявіў, што іх прадстаўнікі возьмуць удзел у назіранні за рэферэндумам.

Місія назіральнікаў ад СНД агучыць высновы і ацэнкі па выніках маніторынгу рэферэндуму ў Беларусі 28 лютага, паведаміў БелТА **першы намеснік старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД, кіраўнік штаба місіі назіральнікаў ад СНД Леанід АНФІМАЎ.**

«Усе назіральнікі будуць строга прытрымлівацца заканадаўства Рэспублікі Беларусь пры правядзенні маніторынгу за ходам галасавання, — заявіў Леанід Анфімаў. — Адзіная задача місіі — дапамагчы забяспечыць паспяховае і дэмакратычнае правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму».

Прадугледжваецца, што ў рабоце місіі назіральнікаў ад СНД возьмуць удзел 100—120 назіральнікаў. Асноўная група назіральнікаў ад СНД прыбудзе ў Беларусь за два-тры дні да рэферэндуму і будзе ажыццяўляць назіранне ва ўсіх рэгіёнах краіны. Місію ўзначаліць намеснік старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД Ільхам Нематаў.

Ігар КАРПЕНКА ўручае Леаніду АНФІМАВУ пасведчанне назіральніка.

Тым часам

Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў запусціла ў работу афіцыйныя каналы ў сацыяльных сетках і месенджарах: Vkontakte, Instagram, Facebook, Telegram, Viber.

На кожным рэсурсе будзе змяшчацца дакладная і аператыўная інфармацыя аб дзейнасці Цэнтральнай камісіі, прынятых рашэннях, выніках выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў, а таксама аб іншых важных пытаннях, якія датычацца кампетэнцыі Цэнтральнай камісіі.

Дакладнасць і аб'ектыўнасць размешчанай інфармацыі будзе садзейнічаць процідзеянню сучасным выклікам і пагрозам у сферы інфармацыйных тэхналогій, а таксама своечасоваму рэагаванню на падзеі ў краіне і хуткай дастаўцы неабходнай інфармацыі насельніцтву, лічаць у Цэнтрвыбаркаме.

«Людзі адзіныя ў тым, што мы павінны захаваць беларускую мадэль дзяржаўнасці»

Закон аб Усебеларускім народным сходзе (УНС) парламентарыі гатовы распрацаваць на працягу года пасля рэферэндуму, калі на ім жыхары краіны падтрымаюць праект Асноўнага Закона. Аб гэтым паведаміў журналістам, адказваючы на пытанне карэспандэнта БелТА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.

Паводле яго слоў, у выпадку адабрэння змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю на працягу года маюць намер распрацаваць закон аб УНС. «Затым на працягу двух гадоў мы павінны прывесці ў адпаведнасць з Канстытуцыяй усе нашы заканадаўчыя акты. На сённяшні дзень гэта прыкладна 20 кодэксаў, якія трэба будзе перапрацаваць, і каля 60 законаў», — растлумачыў Уладзімір Андрэйчанка.

Учора ён сустрэўся з калектывам Глыбоцкай цэнтральнай раённай бальніцы, дзе адкрылі новы кабінет камп'ютарнай тамаграфіі. Старшыня Палаты прадстаўнікоў паразмаўляў з медыкамі аб будучым рэферэндуме, расказаў аб асноўных новаўвядзеннях і палажэннях праекта Асноўнага Закона.

«Сустрэчы з калектывамі паказваюць, што гэта вельмі важная форма стасункаў з грамадзянамі.

Людзі адзіныя ў тым, што мы павінны захаваць беларускую мадэль дзяржаўнасці, якая арыентавана на чалавека, што датычыцца медыцыны, то на ўмацаванне яго здароўя. Наша і будучыя пакаленні абавязаны захаваць незалежнасць, тэрытарыяльную цэласнасць краіны. Яшчэ прагучалі меркаванні, што будучыня нашай краіны залежыць ад кожнага з нас», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

У глыбоцкай бальніцы пройдзены чарговы этап стварэння міжраённага медыцынскага шматпрофільнага цэнтра. «Гэтаму папярэднічала вялікая работа.

За апошні час створаны тры новыя аддзяленні: інфекцыйнае, якое будзе абслугоўваць шэраг раёнаў заходняй часткі Віцебскай вобласці, стаматалагічны цэнтр, а таксама мамалагічны кабінет. Сёння адкрылі кабінет камп'ютарнай тамаграфіі — гэта новы ўзровень у медыцынскім абслугоўванні насельніцтва. Усё гэта адпавядае тым палажэнням, якія былі выказаны Прэзідэнтам падчас Паслання беларускаму народу і парламенту, каб мы пачалі масавую дыспансерызацыю людзей. У тым ліку каб чалавеку выдзяляўся адзін дзень на гэта», — дадаў спікер ніжняй палаты парламента.

«Важна, каб нашы дзеці і ўнукі ведалі праўду аб гэтай вайне і гераізме людзей»

Цікавасць да змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон у грамадскасці вялікая. Пра гэта сведчаць нават такія традыцыйныя ўжо формы зносін прадстаўнікоў улады з насельніцтвам як прамыя тэлефонныя лініі.

У прыватнасці, **старшыня камітэта Дзяржканторолю Васіль ГЕРАСІМАЎ** падзяліўся сваімі назіраннямі пасля правядзення такой прамой лініі для жыхароў Брэсцкай вобласці. «Напэўна, палова званкоў была звязана не столькі са скаргамі, колькі з прапановамі па паляпшэнні жыцця. Прыемна, што людзі не безуважна паставіліся да змяненняў у Канстытуцыю, — сказаў ён. — Здавалася б, грамадскае абмеркаванне скончылася, але дыскусіі працягваюцца.

Адзін мужчына сябе бачыць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу. Пацікавіўся, якім чынам ён можа там апынуцца. Жанчына тэлефанавала, падтрымлівала кіраўніка дзяржавы наконт замацавання нормы аб недапушчэнні скажэння гістарычнай памяці. Гэта, безумоўна, радуе. Думаю, гэта будзе працягвацца і далей».

У прыватнасці, пенсіянер з Брэста расказаў, што сярод прыяцеляў і суседзяў часта абмяркоўваюць праект змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. «Людзі выказваюцца, што будзе правільным надаць канстытуцыйны статус Усебеларускаму народнаму сходу. Мы зможам удзельнічаць у прыняцці рашэнняў. Згодны і з тым, што Прэзідэнт перадае частку паўнамоцтваў», — сказаў мужчына. Жыхарка Баранавіч падзялілася, што яе найбольш закранула прапанова замацаваць у Асноўным Законе норму аб захаванні гістарычнай памяці: «Мы памятаем з апавяданняў нашых дзядуль і бабуль гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, колькі людзей загінула, якой цаной Перамога дасталася нашаму народу. У кожнай сям'і вайна аднята чыёсьці жыццё. Вельмі важна, каб нашы дзеці і ўнукі ведалі праўду аб гэтай вайне і гераізме людзей. Нашы бацькі перадалі нам гэтую памяць, а мы павінны перадаць яе далей сваім нашчадкам».

ДАСЛОЎНА

Член Пастаяннай камісіі Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Людміла ЗДОРЫКАВА:

— Напярэдзе нас чакае значная і адказная падзея — рэспубліканскі рэферэндум па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Праект абноўленага Асноўнага Закона можна з поўным правам назваць вынікам шырокамаштабнага грамадскага дыялогу, калектыўнай працы ўсіх беларусаў. Падобнага досведу не існавала не толькі ў нашай краіне, але, мабыць, і ва ўсім свеце. Разумеючы ўнікальнасць гістарычнага моманту, грамадзяне актыўна падключыліся да працэсу канстытуцыйнага будаўніцтва. Ужо пасля афіцыйнага апублікавання праекта ў рамках усенароднага абмеркавання ў Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі паступіла каля дзевяці тысяч прапаноў ад беларусаў, грамадскіх аб'яднанняў і дзяржаўных органаў.

Магчымасць выказаць сваю думку была дадзена кожнаму, менавіта таму работа па «дашліфоўцы» дакумента не спынялася да апошняга моманту. Дзякуючы неабыякавасці і актыўнай пазіцыі нашых суайчыннікаў па выніках усенароднага абмеркавання праекта змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь выніковы варыянт дадаўся шэрагам актуальных карэкціровак. Змястоўны матэрыял, які быў выкарыстаны экспертамі пры канчатковай дапрацоўцы праекта змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі, у будучым стане асновай удасканалення многіх галін айчыннага заканадаўства. Важна разумець, што тыя прынцыпы, якія мы сёння закладваем у праект Канстытуцыі, вызначаць вектар развіцця краіны і грамадства на дзесяцігоддзі. Гэта законы і нормы, на аснове якіх будуць жыць і працаваць новыя пакаленні беларусаў. Абноўленая Канстытуцыя стане падмуркам для пабудовы будучыні нашай краіны.

Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.

КАНЕЦ МАРШРУТУ

Чаму Літва ператвараецца ў лагістычны тупік?

З 1 лютага, у сувязі са спыненнем транзіту «Беларускалія» праз Літву, у порце Клайпеда стаіць цішыня і адчуваецца нявызначанасць, паведаміў партал Baltnews. Па публікаваных прэсай меркаваннях, літоўскія кампаніі, звязаныя з пастаўкай угнаенняў ужо дзесяць гадоў, мэр горада, партовыя тэрміналы ад спынення работы радасці і душэўнага ўздыму, вядома ж, не адчуваюць. Бізнесмены адзначаюць, што бяздумнае перапыненне такога грузапатоку, якім быў транзіт прадукцыі «Беларускалія», — вельмі вялікая страта. Найперш для самой Літвы. Беларусь вымушана прымаць адпаведныя меры ў адказ. Гаворка ідзе пра значныя сумы, якія, заўважаюць эксперты, у суме вылічваюцца мільярдамі долараў. Таксама не варта забываць і пра страту дзелавога іміджу балтыйскай краіны, якая зарабляла вялікія сродкі ад транзіту. Чаму Літва ператвараецца ў лагістычны тупік?

ПАКУТУЮЦЬ УСЕ

Недружалюбная палітыка Літвы прыносіць бізнесу балтыйскай краіны горкі плён. Як быццам мала было паслядоўнага разрыву эканамічных сувязяў з Расіяй, Вільнюс за апошнія два гады рабіў усё, каб гэта адбылося і ў адносінах да Беларусі. У выніку ў Літве нявызначанасць змяншаецца транзіт грузаў і тавараабарот з усходнімі суседзямі. Пакутуюць не толькі буйныя кампаніі балтыйскай краіны, але і простыя бізнес, які займаецца няхітрым прыгранічным гандлем.

Страты няўхільна павялічваюцца. У асацыяцыі грузаперавозчыкаў Літвы Linava заявілі, што толькі з-за харчовага эмбарга Беларусі перавозчыкі страцяць звыш 100 мільёнаў еўра, паведаміла газета Respublika. Транспарціроўка прадуктаў харчавання з Літвы ў Беларусь ацэньваецца прыкладна ў 13 мільёнаў еўра ў год. З-за гэтага можа падацца, што для грузаперавозчыкаў балтыйскай дзяржавы страта надзейнага партнёра не такая ўжо трагедыя. Але вось няўдача, геаграфічнае становішча Літвы такое, што яна мае магчымасць з карысцю развіваць эканамічныя сувязі з Беларуссю і Расіяй з аднаго боку і з краінамі Еўрапейскага саюза — з другога, адзначыў Baltnews.

Дзякуючы такому размяшчэнню Літва магла выкарыстаць сваю тэрыторыю не столькі дзеля продажу еўрапейскіх прадуктаў харчавання ў Беларусь, колькі дзеля экспарту тавараў у Расію, дзе попыт на іх у пэўнай меры захаваўся нават пасля санкцый Бруселя і рэстрыкцый Масквы ў адказ, заўважыў Baltnews. Кажучы прасцей, Мінск быў важным мастом для Вільні, якая зарабляла на перапраўцы еўрапейскіх тавараў у Расію.

Праблема яшчэ і ў тым, што на практыцы літоўскім кампаніям не так проста будзе іх адшукаць. Як падкрэсліў эксперт, рынак перавозак у ЕС вельмі канкурэнтны. Ва Усходняй Еўропе ідзе цвёрдая барацьба паміж балтыйскімі фірмамі, польскімі, балгарскімі і іншымі. Змагацца за новага кліента вельмі цяжка, бо цэны на падобныя паслугі і так максімальна нізкія, тут ужо ідзе бойка за выжыванне.

І вось што цікава. Па выніках 2021 года, як паведаміла газета Financial Times, Літва, Эстонія і Латвія рэзка павялічылі гандлёвы абарот з Беларуссю. Імпарт Літвы з Беларусі дайшоў да адзнакі 1 млрд еўра, калі параўнаць з 2020-м, то ён узрос на 50 працэнтаў. Латвія павялічыла аб'ём закупак тавараў і сыравіны з Беларусі на дзве трэці ў параўнанні з 2020 годам — да 407 млн еўра. Эстонія за першыя 10 месяцаў 2021 года імпартавала з Беларусі тавараў і паслуг на суму ўдвая большую, чым у 2020-м, — 522 млн еўра.

«Пры гэтым геаграфічнае становішча і традыцыйныя сувязі падштурхоўваюць бізнес у Літве і Беларусі супрацоўнічаць, таму, як толькі з'яўляецца акно магчымасцяў, аб'ёмы гандлю павялічваюцца, як мы гэта бачылі ў 2021-м. Праблема ў тым, што палітыкі з зайздроснай перыядычнасцю «зразаюць» гэтыя дасягненні «новымі ініцыятывамі», — заўважыў Baltnews літоўскі палітолаг Вадзім Валавы.

БАЛЮЧЫ ЎДАР

Бізнес Прыбалтыкі, у тым ліку літоўскія кампаніі, вельмі нават не супраць мець дзелавыя адносіны з усходнім суседам, што б там ні рабілі палітыкі. Аднак літоўскім уладам гэта нецікава. Ім важней выконваць санкцыі Еўрасаюза супраць Беларусі. Па сутнасці, як заўважыў Baltnews, Вільнюс сам справакаваў эмбарга, якое Мінск увёў супраць свайго суседа. Дзякуючы сваёй «дружалюбнай і прадуманай» знешняй палітыцы Літва паступова ператвараецца ў лагістычны тупік, у які ўсё менш возяць тавары і сыравіну. Дэ-факта балтыйская рэспубліка ўсё больш аказваецца ў ізаляцыі.

Прыкладаў недружалюбнай палітыкі шмат. Узяць хаця б выпадак у канцы снежня мінулага года. У пункце пагранічнага кантролю «Мядзінінкай» літоўскія мытнікі адмовіліся прапускаць груз з аўтазапчасткамі прадпрыемства БелАЗ, якія накіроўваліся ў Боснію і Герцагавіну. У выніку груз коштам 210 тысяч еўра так і не паступіў заказчыку.

Відавочна, што рана ці позна кіраўніцтва Беларусі павінна было выкарыстоўваць люстраныя захады. Праблема для Прыбалтыкі ў тым, што «адваротны ўдар» з боку Мінска такі ж балючы для Літвы, Эстоніі і Латвіі, як і санкцыі супраць Беларусі. Беларусь летась займала пятае месца ў спісе найбуйнейшых рынкаў рээкспарту літоўскіх тавараў. За студзень — кастрычнік мінулага года аб'ём тавараў і сыравіны (не толькі прадукты харчавання) па гэтай лініі склаў каля 730 мільёнаў еўра. Цяпер жа балтыйская краіна страчвае такі рынак.

Варта нагадаць, што Літва раней ужо страціла транзіт беларускіх нафтапрадуктаў. Колішні літоўскі прэм'ер Саўлюс Сквярняліс заяўляў, што шкода эканоміцы Літвы ад скасавання дамовы «Літоўскіх чыгунак» з «Беларускаліем» можа скласці ад аднаго да некалькіх мільярдаў еўра. Санкцыі, уведзеныя супраць «Беларускалія», не прынеслі чаканага выніку і нават далі адваротны эфект. Пра гэта заявіў міністр замежных спраў Літвы Габрыэлюс Ландсбергіс, паведаміла газета Respublika.

Па словах міністра, адпаведныя меры справакавалі рост цэн калійнай прадукцыі, тым самым павялічыўшы і даходы «Беларускалія».

КРАДЗЕЖ І АДКАТЫ

Міністр транспарту і камунікацый Марус Скуадзіс сцвярджае: Літве пагражаюць сур'ёзныя праблемы пасля скасавання дагавора. За свядома разваленую здзелку і магчымыя фінансавыя наступствы адказваць будзе чыгуначная кампанія, якая з'яўляецца дзяржпрадпрыемствам. Аднак нават на ўзроўні прэзідэнта Гітанаса Наўседы прынята лічыць надзённай неабходнасцю падтрымку санкцый ЗША.

Не варта думаць, быццам кансерватары, якія кіруюць краінай, не разумеюць фінансавых страт, якія пагражаюць. Паставім пытанне інакш: а калі Вільнюсу выгадная адмова ад беларускага транзіту? Не толькі ад грузаў «Беларускалія», а ў прынцыпе ад усяго існуючага на сёння транзіту, які забяспечвае існаванне чыгуначнікаў і 1/3 гадавога грузаабароту порта, адзначыў Baltnews.

Вось які пасьянс раскладваецца. «Літоўскія чыгункі» апынуліся пад пагрозай банкруцтва, бо нават частковае задавальненне іску юрыдычна добрапрыстойных беларускіх партнёраў не прадугледжвае іншых перспектыў. Клайпедскі марскі порт таксама перастае ўносіць у бюджэт былыя напаўненні.

Такім чынам, абодва дзяржаўныя прадпрыемствы можна канчаткова збанкрутаваць і выгадна прыватызаваць для наступных продажаў. Кансерватары — партыя, якая прадстаўляе і абараняе буйны літоўскі капітал. Алігархі яе шчодра фінансуюць у абмен на некаторыя паслугі. А цяперашняя гісторыя як дзве кроплі вады падобная на гісторыю прыватызацыі нафтаперапрацоўчага завода (адзінага ў краінах Балтыі) у Мажэйкяй. З той толькі розніцай, што ў якасці апошніх пакупнікоў разглядаюцца не палякі, а амерыканцы.

Долараў у іх з лішкам, а такіх прынадных кавалкаў, як незамярзальны порт і чыгуначная магістраль Варшава — Мінск — Вільня — Рыга — Талін — Санкт-Пецярбург з адгалінаваннямі на Клайпеду, Ліду — Баранавічы і Калінінград, у Еўропе засталося няшмат.

Як кажа прэсе Аста Скайсгірытэ, саветнік Наўседы, Вільнюс абавязаны «абараніць інтарэсы рэспублікі». Калі яны зводзяцца да распродажу нацыянальнай уласнасці, тады гэта інтарэсы не дзяржавы, а карумпаваных палітыкаў, цесна звязаных з алігархамі. Тут ужо нічога не зробіш: адкрыты крадзеж і адкаты сталі нормай літоўскага ліберальнага рынку і капіталістычнай мадэлі эканомікі.

ЖОРСТКІЯ МЕРЫ

Днямі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду пры неабходнасці рэалізаваць адносна Літвы шэраг мер у адказ, калі літоўскі бок адмовіцца прапускаць беларускія грузы. Сказана — зроблена. Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка расказаў аб запланаваных захадах, паведаміла БелТА. «Сапраўды, літоўскі бок перастаў прымаць нашы цягнікі, якія транспартавалі калій у порт Клайпеды для адгрузкі. Меры ў адказ будуць жорсткія. Мы, як кажуць, адкажам сіметрычна. Рашэнне прынята, яно закране чыгуначны транспарт, які ідзе з тэрыторыі Літвы, — сказаў Раман Галоўчанка. — Мы прапанавалі літоўскім калегам дыялог па гэтым пытанні, дзверы ніколі не зачынены. Мы звярнуліся з прапановай у прававым полі правесці кансультацыі і вызначыць далейшыя нашы ўзаемаадносіны. На нашу думку, Літва, прыняўшы такое рашэнне ў аднабаковым парадку, парушыла міжураванне пагадненне аб чыгуначных зносінах, не кажучы аб дакументах, якія рэгулююць пытанні транзіту для краін, што не маюць выхаду да мора. Мы прапанавалі варыянт. Калі нам не адкажуць, у найбліжэйшыя дні ўвядзём меры ў адказ».

Прэм'ер-міністр Беларусі падкрэсліў, што эканоміка Літвы зараз нясе страты з-за прынятага рашэння, у прыватнасці транспартны сектар (чыгунка, порт). «Мы даўно да гэтай сітуацыі рыхтаваліся, свае пастаўкі пераарыентавалі. За кошт больш доўгага лагістычнага пляча ў РФ нашы вытворцы крыху страцілі ў маржынальнасці, але яна будзе кампенсавана ростам сусветных цэн. Так што мы, па сутнасці, нічога не страцілі, страціла эканоміка Літвы. Больш за тое, мы спагонім усе штрафы, якія нам належаць за скасаванне кантрактаў на перавозку з іх боку. Адпаведныя іскавыя заявы пададзены. Спагонім з іх у тым ліку ўпушчаную выгаду. Гэта вялікія сумы», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Пётр ДУНЬКО.

• ДАСЛОЎНА

«Мы з Літвой жылі і будзем жыць як сапраўдныя суседзі»

Літоўцы як народ ніколі не былі і не будуць для беларусаў ворагамі. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, адказваючы на пытанні пасля звароту з Пасланнем беларускаму народу і парламенту. Разам з тым ёсць і такія людзі ў Літве, якія сваімі ўчынкамі і заявамі заслужылі асабістае негатыўнае стаўленне кіраўніка беларускай дзяржавы. «Я ўмею, вопыт у мяне ёсць, аддзяляць агідных кіраўнікоў, якія страцілі кантакт з народам, і народ. Літоўцы — класныя людзі, працаўнікі. А тыя, хто там аблудныя, ачмурэлыя і прыкормленыя рознага роду прапагандысты, — думаю, яны ці хутка схлынуць куды-небудзь, ці літоўскі народ іх проста выкіне. А мы з Літвой жылі і будзем жыць як сапраўдныя суседзі — прыйдзе час», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кошт аціплення ў Германіі ўзрос на 107 працэнтаў

Пра гэта паведаміла нямецкае выданне Spiegel са спасылкай на даныя партала CHECK24, які дазваляе параўнаць цэны на тавары і паслугі ў краіне. У студзені 2021 года сярэднестатыстычная дваровая гаспадарка павінна была плаціць за газ у сярэднім 1193 еўра, цяпер гэта сума складае 2472 еўра. Такая сітуацыя склалася ў выніку павышэння попыту на газ у сувязі з адменай многіх каранавірусных абмежаванняў, у той час як запоўненасць падземных газавых сховішчаў у Еўропе аказалася значна ніжэйшай, чым у папярэднія гады. Кошт электраэнергіі ў Германіі таксама дасягнуў рэкорднага ўзроўню.

САА3 заклікала наладзіць утылізацыю медыцынскіх адходаў, якія ўтварыліся за час пандэміі

Медыцынскія адходы, якія ўтварыліся ў выніку мер рэагавання на пандэмію COVID-19, пагражаюць здароўю людзей і навакольнаму асяроддзю і патрабуюць належных мер утылізацыі. Пра гэта гаворыцца ў дакладзе Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (САА3), паведаміў Цэнтр навін ААН. З сакавіка 2020-га да лістапада 2021-га толькі ў рамках сумеснай надзвычайнай ініцыятывы ААН па барацьбе з COVID-19 было закуплена прыкладна 87 тысяч тон сродкаў індывідуальнай аховы. Амаль усе гэтыя медыцынскія камбінезоны, акуляры і іншыя вырабы ў выніку ператварыліся ў адходы. У дакладзе САА3 таксама адзначаецца, што ў рамках барацьбы з пандэміяй было заказана звыш 140 млн тэст-сістэм, з якіх могуць утварыцца 2,6 тысячы тон адходаў. Акрамя таго, у свеце было ўведзена больш за 8 млрд доз вакцын, што прывяло да з'яўлення яшчэ 144 тон адходаў у выглядзе шпрыцаў, іголак і кантэйнераў для іх збору.

YouTube-канал прэм'ера Індыі набраў 10 мільёнаў падпісчыкаў

Як паведаміла газета Times of India, па гэтым паказчыку кіраўнік індыйскага ўрада лідзіруе сярод іншых сусветных лідараў, якія актыўна карыстаюцца сацыяльнымі сеткамі і іншымі сэрвісамі. На колькасці падпісчыкаў на YouTube-канале ён далёка абышоў прэзідэнтаў Бразіліі Жаіра Балсанару (3,7 млн), Мексікі Андрэса Мануэля Лопеса (3 млн) і Інданезіі Джока Відода (2,8 млн). У верасні гэтага года Модзі споўніцца 72 гады. Узрост не перашкаджае яму заставацца энтузіястам у сферы выкарыстання сацсетак на пасадзе кіраўніка ўрада.

Сямейная газета

Выпуск № 2 (184)

УМЕЙЦЕ ПРЫМАЦЬ ДАПАМОГУ

Ужо ідзе другі месяц, як мой трохгадовы сынок мне дапамагае. Практычна заўсёды і ва ўсім. Рэжым «дапамога» ўключыўся абсалютна нечакана. Аднойчы, калі я наводзіла ў хаце парадак, Арцём выхапіў з маіх рук шчотку пыласоса і сказаў, што далей прыбіраць будзе ён, а ты мама, маўляў, займіся нечым іншым.

Такога павароту падзей у развіцці сына я чакала, але, прызнаюся, не так рана. Моўчкі глядзела, як ён пыласосіць і, шчыра кажучы, не вельмі радавалася такой «дапамозе». Смецце, якое было на падлозе, так і працягвала там ляжаць, а шчотка зацягвала ў сябе не тое, што трэба. Цярпенне скончылася, калі ад перагрэву прыбор выключыўся, і, адпаведна, мой план хутка прыбраць у кватэры праваліўся.

Калі праз некалькі дзён Арцём, падсунуўшы да шафкі табурэт і ўскараскаўшыся на яго, сказаў, што будзе дапамагаць мне пячы бліны, цеста на якія я ўжо пачала замешваць, я ўспрыняла гэта больш спакойна. Няхай, думаю, вучыцца, пакуль ёсць жаданне. Ну і што, калі нешта не атрымаецца! Арцемій жа імкнуўся апраўдаць мой давер: старанна насыпаў у шклянкі адпаведныя порцыі цукру і мукі, убіваў у міску яйкі, наліваў малако, якое, разагнаўшыся, ледзь не адправіў на падлогу. Потым з вялікай радасцю ўсё перамешваў, набіраў атрыманую вадкасць у апалонік і з выкананнем правілаў бяспекі асцярожна пераліваў яе на патэльню. Цудоўныя бліны, шчыра сказаць, тады атрымаліся, хоць адзін з аўтараў гэтага кулінарнага шэдэўра — малодшы — іх чамусьці не еў...

Адным словам, на кухні Арцемій мне дапамагае дастаткова часта. Акрамя бліноў, мы з ім ужо і пельмені ляпілі, і піражкі пяклі, рэзалі салату (у яго абавязкі ўваходзіла пачысціць ад шкарлупіны яйкі і дастаць з абгортак крабавыя палачкі), нават рабілі торт. А яшчэ малы вельмі любіць мыць посуд. Толькі мыць — гэта мякка сказана. Ён падсоўвае да ракавіны крэсла, становіцца на яго, уключае ваду і напаўняе ёй увесь посуд. Потым туды выліваецца вялікая колькасць мыйнага сродку, вадкага мыла — чым больш атрымліваецца мыльных бурбалак, тым весялей. Калі ж у ракавіне посуду няма, Арцём усё роўна мые посуд: ён адпраўляе ў ракавіну ўсё, што стаіць побач: чыстыя кубкі, талеркі, лыжкі. І калі своечасова не згледзіш, дарэмна будуць ліцца і вада, і мыйныя сродкі. Хоць яны і пры ўмове бруднага посуду дарэмна льюцца: пасля выключэння рэжыму «дапамагаць» перамываць посуд даводзіцца мне. А гэта ўжо як мінімум не эканомна. У гэтым плане, як кажуць псіхалогі, больш важкі задзел на будучыню: у выніку дзіця навучыцца мыць посуд і будзе спраўляецца з гэтым хатнім абавязкам, калі вы яго аб гэтым папросіце.

Яшчэ, па словах спецыялістаў, якія працуюць з дзецьмі, жаданне дапамагаць уласцівае людзям ад нараджэння. Таму задача бацькоў — такую важную якасць у дзяцей развіць. Часта дарослыя нават не заўважаюць, як перашкаджаюць гэтаму. Сама прыкмячаю, як нярэдка хочацца сказаць Цёміку, які ўжо паставіў крэсла каля ўмывальніка і збіраецца «мыць посуд», каб пайшоў гуляць, глядзець мульцікі або маляваць — галоўнае, каб не перашкаджаў. Яно зразумела, хутчэй і прасцей зрабіць усё самой, чым потым выпраўляць памылкі або перароблваць усё наноў. Аднак такой тактыкай выхаваць будучага памочніка не атрымаецца. Тым больш ні ў якім разе нельга сварыцца на дзіця за няўдалыя спробы дапамагчы. Каб не засмуціць маму, наступны раз дзеці не захочуць увогуле брацца за тую ці іншую работу.

Вы б бачылі, з якім энтузіязмам Цёма бярэцца дапамагаць бацьку! Гэта вам не посуд памыць і нават не прапыласосіць. І муж у гэтым плане больш цярплівы, чым я. Ён дасць сыну ў рукі і адвёртку, і пласкагубцы, і шурупавёрт — прычым не проста патрымаць, а выкарыстаць па прызначэнні (вядома, усё робіцца пад кантролем). І, трэба сказаць, у малога атрымліваецца: мне дакладна не будзе сорамна за сына перад яго будучай жонкай.

Я нават падумаць не магла, што Арцём будзе ўдзельнічаць у разборы навагодняй ёлкі. Упрыгожваць — так (гэта ж нашмат цікавейшая справа!). З усёй адказнасцю ён здымаў з калючых ялінак цацкі і ні разу не паскардзіўся, што ўкалоў нейкі пальчык. Пакуль я выносіла на сметнік ёлку, малы збольшага змёў іголкі, мне засталося толькі ўключыць пыласос.

Вядома, я не хвалюся сынам (хоць ён гэтага, безумоўна, заслугоўвае). Сваім досведам дзялюся з тымі бацькамі, якія не дапускаюць малых да хатняй работы. Паверце, лепш вы цяпер патраціце на тую ці іншую справу больш часу (хоць не факт), чым потым будзеце марнаваць яго на ўгаворы свайго дзіцяці-падлетка дапамагчы вам па гаспадарцы. А гэта часта бывае вой як непаспяхова.

Вераніка КАНЮТА.

Тыя, хто побач

Хрысціна ЖУК:

«Аптымізм павінен стаць галоўнай каштоўнасцю!»

Даша, Ксюша і Хрысціна роўна творчасць, любоў і сіла

Пазітыўна, ярка і вельмі карысна — такімі словамі можна апісаць выстаўку «Super Twins», якая адкрылася ў мастацкай галерэі «АртХаос». Аўтары карцін — Ксюша і Даша Рыбчык, двайняткі з дзіцячым цэрэбральным паралічом, і іх мама Хрысціна Жук. Кожную карціну яны ствараюць разам, і таму работы вылучаюцца асаблівай цеплынёй. Як, нягледзячы на цяжкі дыягназ і жыццёвыя складанасці, несці гэтаму свету пазітыў і любоў, «Сямейнай газеце» расказала Хрысціна Жук.

«Дзяўчынкі заўсёды любілі маляваць, і мы заўсёды рабілі гэта разам. Мы садзімся на падлогу, Ксюша ці Даша абапіраюцца на мяне, паколькі самі сядзець не могуць. Я ўкладваю ў іх ручкі пэндзлік ці аловак, часцей за ўсё алейную пастэль, зверху сваёй рукой прытрымліваю, і мы разам так малюем. Пачалося ўсё са звычайных кружкоў — мы іх аб'ядноўвалі, маляваліся кружкі вакол кружкоў. Атрымлівалася вельмі яркая і маляўніча. І я вырашыла зрабіць упрыгожванні з нашых малюнкаў. У нас атрымалася цікавая і незвычайная калекцыя браслетаў, брошак, завушніц. А ўсе нашы малюнкі я стала захоўваць і збіраць. Для мяне гэта было вялікай каштоўнасцю. Я тады праходзіла курс па аўтарскім праве і ў кожным малюнку бачыла аб'ект аўтарскага права. Так і з'явілася наша калекцыя», — расказвае Хрысціна.

У пачатку творчага шляху мамы і дочак думак пра выстаўку не было. Як кажа Хрысціна, ёй было дастаткова калекцыі ўпрыгожванняў і таго, што дзяўчаткі любяць маляваць. Але вяла мара, якая здзейснілася абсалютна выпадкова. Знаёмая літаральна за руку завяла Хрысціну ў галерэю «АртХаос», дзе і зацікавіліся незвычайнымі карцінамі асаблівых мастачак.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Урокі выхавання

ТАТАЎ ПРЫКЛАД

За тры гады я пакідала сына з мужам на ноч толькі двойчы. І абодва разы мяне пасля вяртання чакалі сюрпрызы. У першым выпадку — тры набытыя і клапатліва пасаджаныя дрэўцы абрыкоса, у другім — смачныя блінцы з чарнаплоднай рабінай. Але самы прыемны сюрпрыз заключаецца ў іншым: цяпер замест бясконцага «Мама, ідзі сюды!» Сымон кліча абаіх: «Мама, тата!».

Мне вельмі шкада мужчын, якія лічаць, што выхаванне дзяцей — выключна жаночая справа. І застаюцца ў гэтым плане дзесьці ўбаку. Маўляў, «я кармілец, забяспечваю вас, вольнага часу ў мяне няма». Некаторыя з іх «адкупаюцца» ад дзіцяці дарагімі цацкамі, кніжкамі, цукеркамі. Не разумеючы, што для малечы куды важней разам з татам пагуляць у гэтую новую цацку, пачытаць кніжку, паесці цукерак. Ды насамрэч і не так істотна, што рабіць. Галоўнае — разам.

І кожны раз шчыра радуюся, калі на дзіцячай пляцоўцы ці веладарожцы бачу «вусатага няня» з сынам ці дачкой. Мой сябра, напрыклад, раз на тыдзень дае жонцы магчымасць пабыць сам-насам, забірае дзяцей і бавіць з імі цэлы так званы «татаў дзень». Яны едуць на каток, у боўлінг, ядуць «шкодную» ежу...

Паводле слоў **дзіцячага псіхолага Людмілы ГУБСКАЙ,** ужо з 2-гадовага ўзросту ў дзіцяці з татам павінны быць нейкія агульныя справы, у якіх не ўдзельнічае мама. Гэта могуць быць як штодзённыя рытуалы, так і сумеснае баўленне часу раз на тыдзень. Хтосьці бярэ з сабой малечу на аўтазапраўку альбо на аўтамыйку. Хтосьці ездзіць у кавярню па пірожныя для сямейных пасядзелак. Хтосьці замест традыцыйнага купання ладзіць перад сном марскія баі з воднымі пісталетамі. Хтосьці чысціць камп'ютар адмысловым маленькім пыласосам. Прычым вельмі важна, каб агульны занятак быў у радасць тату. Не варта, пабачыўшы, што муж сяброўкі ходзіць з сынам на бокс, прымушаць рабіць тое ж самае свайго. Лепш няхай ён далучае малечу да занятку, ад якога ў яго самога свецяцца вочы. Тады гэты запал абавязкова перадасца і дзіцяці.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

ДАРОЖНАЯ КАРТА СТАЛІЧНАГА СПЦ

Ад дзіцячага садка да першых курсаў ВНУ

Абласных сацыяльна-педагагічных цэнтраў у краіне зусім нядаўна было шэсць. Сталічны стаў сёмым (у ліпені 2021-га), хоць патрэба ў ім існавала даўно. У Мінску больш як 380 тысяч непаўналетніх, сярод якіх дзеці, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзеці-сіроты і малыя, якія засталіся без апекі бацькоў, дзеці з рознымі залежнасцямі і праблемамі ва ўзаемаадносінах. Пра мэты і планы ўстановы расказалі яго супрацоўнікі.

Супрацоўнікі Мінскага гарадскога СПЦ. Справа — Зінаіда ВАРАБ'ЁВА.

Галоўнае — абарона дзяцей

Задача Мінскага гарадскога СПЦ усёахопная — абарона правоў і законных інтарэсаў дзяцей праз каардынацыю дзейнасці спецыялістаў СПЦ і ўстаноў адукацыі. Тут прадугледжаны таксама кансультацыі педагогаў, прававая дапамога непаўналетнім і іх законным прадстаўнікам, псіхалагічная педагагічная падтрымка сем'яў, на ўтрыманні якіх знаходзяцца дзеці-сіроты, і малыя, якія засталіся без апекі бацькоў.

Стварэнне Мінскага гарадскога і абласных СПЦ было ўнесена асобным пунктам у Нацыянальны план дзеянняў па паляпшэнню становішча дзяцей і абароне іх правоў на 2017—2021 гады, і цяперашнія яго супрацоўнікі займаюцца вялізным блокам «дзіцячых пытанняў». У кампетэнцыі аддзела каардынацыі дзейнасці СПЦ і ўстаноў адукацыі праблемы непаўналетніх у арганізацыях усіх ступеняў: ад дзіцячага садка да першых курсаў ВНУ, пакуль дзецям не споўнілася 18 гадоў.

— Спецыялісты аддзела займаюцца праблемамі, звязанымі з суіцыдальнымі паводзінамі дзяцей, праявамі правапарушэнняў непаўналетніх, насілля ў дачыненні дзяцей ці ў іх асяроддзі; булінгу; залежнасці ад алкагольных і наркатычных рэчываў, камп'ютару, — акрэсліла спіс задач **Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, намеснік дырэктара Мінскага гарадскога сацыяльна-педагагічнага цэнтра.** — А ўвогуле, і сацыяльнае сіроцтва, і дзіцячыя залежнасці ад розных праяў паходзяць найперш з сям'і, таму працаваць трэба не толькі з дзецьмі, але і з бацькамі.

На аддзел абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей якраз і ўскладзена задача прафілактыкі сацыяльнага сіроцтва, развіцця сямейных форм уладкавання малых, дэінстытуцыялізацыі дзяцей-сірот, іх сацыялізацыя і постінтэрнатнае суправаджэнне.

«Адзіная сям'я — адзіная краіна!»

Дарожную карту з такой назвай стварылі ў аддзеле абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей для выканання пастаўленых задач. Мерапрыемствы, якія прадугледжаны гэтым дакументам і разлічаны на тры гады, маюць на мэце паляпшэнне якасці жыцця выхаванцаў дзіцячых дамоў, павышэнне прафесійных кампетэнцый спецыялістаў і фарміраванне пазітыўнага меркавання аб дзецях-сіротах.

— Нам хацелася скласці такі план работы нашых аддзелаў, каб кожны спецыяліст бачыў, куды мы ідзём, якім шляхам і навошта, таму і з'явіліся дарожныя карты, — патлумачыла намеснік дырэктара. — Яны адрозніваюцца ад звычайнага планавання тым, што ў дакуменце акрэсліны праблемы, вызначаны іх прычыны, распрацаваны блок узаемазвязаных мерапрыемстваў, скіраваных на яе ўстараненне, а таксама ўказаць вынікі, якія павінны атрымацца. А выканаўцы гэтай дарожнай карты — не толькі нашы спецыялісты, а і прафесіяналы ўстаноў адукацыі. У дадатак да некаторых мерапрыемстваў створана яшчэ і тэхналагічная карта. У дарожнай карце закладзена таксама і праектная дзейнасць.

Аналагічную дарожную карту распрацоўваюць і ў аддзеле каардынацыі дзейнасці СПЦ і ўстаноў адукацыі.

— Карта складаецца з пяці блокаў, якія з'яўляюцца адначасова і праблемамі, што мы вырашаем, — расказала **Вікторыя БІЗУКОЙЦЬ, сацыяльны педагог Мінскага гарадскога СПЦ.** — Найперш гэта дрэннае становішча ў сем'ях, дзеці якіх дэманструюць асацыяльныя паводзіны і з'яўляюцца крыніцамі праяў насілля і суіцыдальных паводзін. Унутрысямейныя фактары мы ўключылі ў другі блок. У ім плануем мерапрымствы, скіраваныя на павышэнне бацькоўскай свядомасці, бо таты і мамы часта валодаюць недастатковымі кампетэнцыямі па выхаванні дзяцей, ды і ў самой сям'і таксама ёсць пэўныя сацыяльныя праблемы.

У трэцім блоку вывучаюцца псіхалагічныя асаблівасці самога дзіцяці. Спецыялісты адпаведных устаноў праводзяць з малымі кансультацыі, дзе і высвятляецца, ці ёсць праблема. А таксама карэктуюць асабістыя якасці, якія не ўпісваюцца ў звычайную мадэль паводзін (залішняя адхіленасць ад калектыву, заніжаная або завышаная самаацэнка). Чацвёрты блок прысвечаны педагагічным кампетэнцыям, пяты можна назваць «Мода на здаровы лад жыцця».

Велізарны пласт работы

Адна з формаў сямейнага ўладкавання дзяцей — іх выхаванне прыёмнымі бацькамі і бацькамі-выхавальнікамі ў дамах сямейнага тыпу. У цэнтры зрабілі сацыяльна-рэкламныя лісты, у якіх яны шукаюць адказных людзей на гэтую ролю і плануюць візуалізаваць інфармацыю яшчэ і ў роліках.

— Для бацькі-выхавальніка ці прыёмнага бацькі важна не марнаваць час, прыходзячы ў цэнтр штораз, як з'яўляецца нейкая праблема. Каб вырашаць яе тэрмінова, павінна быць месца, куды бацькі могуць звярнуцца ў рэжыме анлайн, — упэўнена Зінаіда Вараб'ёва. — Нашы спецыялісты мяркуюць прызначаць дні, калі з бацькамі пра іх патрэбы будуць гутарыць кваліфікаваныя спецыялісты. Напрыклад, кожная серада з 10 да 12, калі дзеці ў школе. Асобныя гадзіны плануем прызначаць для павышэння кампетэнцый і прафесійнай падтрымкі саміх спецыялістаў адукацыйных устаноў. Аднаўленне ў бацькоўскіх правах, фарміраванне грамадскага меркавання да прыёмных бацькоў, папярэджанне залежнасцяў... Увесь гэты велізарны пласт работы немагчыма зрабіць без сучасных тэхнічных сродкаў, прынамсі, без інтэрактыўнай дошкі, якая пакуль у праекце.

Кансультацыі спецыялістаў цэнтра і сёння настолькі запатрабаваны, што ім проста не ўдаецца выступаць перад усімі аўдыторыямі. А яшчэ яны ведаюць, з якімі праблемамі сутыкаюцца педагогі-псіхолагі іншых устаноў, і гатовы спрасціць іх работу праз алгарытмізацыю дзейнасці.

— Калі спецыялісты будуць валодаць пакетам праграм, якія дазволяць ім менш часу траціць на афармленне дакументаў, у іх будзе больш магчымасцяў займацца дзецьмі. А зрабіць гэта можна, калі стварыць адзіную базу, дзе вялікая метадалагічная работа будзе выконвацца значна хутчэй, прасцей і захоўвацца ў адным месцы, — падзяліўся **Юрый МАР'ЯНКОЎ, загадчык аддзела каардынацыі дзейнасці СПЦ і ўстаноў адукацыі Мінскага гарадскога СПЦ.**

Адпаведныя праграмы спецыялісты ўжо распрацавалі і пакуль дзеляцца імі з іншымі бясплатна, ды яшчэ і вучаць з імі працаваць. А яшчэ ў цэнтры плануюць стварыць цэлы адукацыйны курс для маладых спецыялістаў.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Асабістае меркаванне

ФАРМІРАВАННЕ ЗВЫЧКІ НЕПРЫНЯЦЦЯ

Прыклады ўжывання шкодных рэчываў дзеці часта бяруць з сям'і, так што з бацькамі трэба працаваць вельмі шчыльна, перакананна Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, намеснік дырэктара Мінскага гарадскога сацыяльна-педагагічнага цэнтра:

— Фарміраваць негатыўнае стаўленне да алкаголю, наркотыкаў, цыгарэт, насілля, прастытуцыі ў дзіцяці трэба гадоў да сямі. Калі дзіця падрыхтаваць да таго, што пераходзіць вуліцу трэба правільна, гэта павысіць яго бяспеку. Аднак бяспеку ад цыгарэт і наркотыкаў таксама трэба фарміраваць і тлумачыць, што такія рэчывы вельмі дрэнныя.

Каб бацькі маглі правільна выхоўваць дзяцей, ім павінны дапамагчы спецыялісты. Непаўналетнія знаходзяцца ва ўстановах адукацыі практычна ад трох да васямнаццаці гадоў, таму педагогі павінны мець высокія прафесійныя кампетэнцыі. Сацыяльны педагог і педагог-псіхолаг, прынамсі, — вельмі важная адзінка ў школе, якая аказвае сацыяльна-педагагічную і псіхалагічную дапамогу ўсім удзельнікам адукацыйнага працэсу: настаўнікам, дзецям, бацькам. І калі мы навучым іх працаваць на апярэджанне, ды яшчэ ў школах будуць ладзіцца мерапрыемствы, скіраваныя на прэвентыўныя меры, то атрымаецца вынік. Мы ж дамагліся, нарэшце, каб вітрыны з цыгарэтамі ў крамах былі схаваныя. Затое электронныя цыгарэты цяпер вельмі прыгожа прадаюць і атручваюць нашых дзяцей.

Алкаголь, які ў крамах выстаўлены напаказ, таксама варта хаваць у нейкія закуткі, а не выстаўляць паліцы з ім на шляху да аддзела з хлебам ці малаком. А лепш было б увогуле зрабіць асобны ўваход у лікёра-гарэлачныя аддзелы, а на дзвярах у іх павесіць плакаты, дзе відавочна паказана, да якога стану прыводзіць алкаголь, колькі сацыяльных сірот з-за гэтага з'яўляецца.

Добра было б таксама ўзмацніць адказнасць вытворцаў алкагольнай прадукцыі за атручванне асобы ў розных сэнсах. Калі чалавек становіцца алкаголікам, то функцыянаванне ЛПП і лячэнне ў іх, а таксама далейшае аднаўленне хворага ў соцыуме магло б адбывацца за кошт вытворцаў алкаголю. Цяпер гэта гучыць, канешне, малаверагодна, але хочацца верыць, што ўжыванне шкодных рэчываў калі-небудзь перастане быць праблемнай звычкай.

«Аптымізм павінен стаць галоўнай каштоўнасцю!»

«Фарбы самі льюцца на паперу»

Цікава, што да нараджэння Дашы і Ксюшы іх мама Хрысціна ніяк не была звязана з мастацтвам. Эканаміст па адукацыі адкрыла ў сабе творчыя здольнасці дзякуючы дзецям. Цяпер маляванне для яе — і любімы занятак з дзецьмі і своеасаблівая медытацыя. «Мы тры гады назад пачалі маляваць разам з дзяўчынкамі. І я палюбіла маляваць сама. У мяне ёсць калекцыя маіх карцін невялікага фармату. Мне падабаецца маляваць невялікія карціны, гэта займае мала часу, якога мне ніколі не хапае. Я іх малюю з пэўным сэнсам у нейкім медытатыўным стане. Калі ў мяне зашкальваюць эмоцыі і мне патрэбна сабрацца, я малюю карціну. Фарбы тады нібы самі льюцца на паперу», — дзеліцца Хрысціна.

«Мне здаецца, трэба даць сабе нейкі тэрмін, каб перажыць гэты боль і негатыўныя эмоцыі. Не варта ад гэтага бегчы. Неабходна гэта перажыць, паплакаць, пасумаваць. А калі ўстаноўлены тэрмін скончыцца — браць сябе ў рукі».

У таленавітай сям'і выпрацаваны свой фірменны стыль — акруглыя лініі і яркія фарбы, якія адлюстроўваюць пазітыўныя эмоцыі. Нягледзячы на цяжкі дыягназ, Хрысціна, Даша і Ксюша нясуць гэтаму свету прыгажосць і яркі настрой, паказваюць людзям, што ўсё магчыма. Як адзначае Хрысціна, цёмныя ці бледныя фарбы ва ўпакоўках алейнай пастэлі яны нават не разглядаюць. А вось жоўты, чырвоны, ружовы, блакітны заканчваюцца вельмі хутка.

Сваім прыкладам Хрысціна, Даша і Ксюша пацвярджаюць вялікую сілу мастацтва, якое сапраўды лечыць — калі не ад фізічных хвароб, то ад душэўнай слабасці. Нездарма «арт-тэрапія» — папулярны сёння напрамак у псіхалогіі. «Гэтыя карціны — як сонечны праменьчык сярод агрэсіі, негатыўнай інфармацыі, напружання. І гэтыя дзеці, якія не ў стане ні гаварыць, ні рухацца, ні заявіць пра сябе, сваімі сонечнымі карцінамі адкрываюць новы свет. Гэтыя дзеці будуць адкрываць святло ўнутры сябе і ўнутры кожнага з нас», — падкрэсліла арт-тэрапеўт, псіхолаг Алена Казленя-Камінская падчас адкрыцця выстаўкі.

Галоўным вынікам арт-тэрапіі для сваіх дзяцей Хрысціна Жук называе станоўчыя эмоцыі, якія ім прыносіць іх любімы занятак — маляванне. «Даша і Ксюша не могуць будаваць вежы ці збіраць канструктар, як звычайныя дзеці. А малюнак дае ім магчымасць нешта зрабіць сваімі рукамі і ўбачыць вынік. Таму ім гэта вельмі падабаецца», — адзначае яна. Хрысціна вельмі стараецца, каб у Дашы і Ксюшы было як мага больш заняткаў, якія прыносяць пазітыўныя эмоцыі. Дзяўчынкі любяць катацца на арэлях — дома з'явіўся спецыяльны гамак. Даша і Ксюша — аматары вады, таму да пандэміі абавязкова наведвалі басейн, цяпер басейн ім замяняе ванна. Дзяўчынкі таксама спрабуюць іграць на хангах — музычных інструментах, падобных на касмічныя талеркі. Ім вельмі падабаецца такая музычная тэрапія.

У такім жа стане «патоку» Хрысціна малюе і з дзяўчынкамі. Не задумваючыся, а проста пераносячы на паперу свой настрой і эмоцыі. Таму глядзець на гэтыя творы Хрысціна раіць не мозгам, а душой: «Нашы карціны можна разглядаць як метафарычныя карты. Кожны на іх бачыць нешта сваё. Калі трэба расслабіцца, выплеснуць эмоцыі, зняць нейкія блокі — малюйце, што адчуваеце. Левай рукой ці правай, не задумваючыся — што адчуваеце, тое і малюйце!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Ні хвіліны спакою

Дашы і Ксюшы па дзевяць гадоў. Сёлета дзяўчынкі пайшлі ў школу на базе Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі. Там у Дашы ўжо з'явілася першая сяброўка Арына. Навучаннем дзяцей займаецца і сама Хрысціна, яна вучыць дзяўчынак чытаць з дапамогай спецыяльных картак. Самае галоўнае для Дашы і Ксюшы цяпер — рэабілітацыйныя заняткі, фізкультура. Фізічнаму развіццю ўдзяляецца шмат часу і сіл. Таму дзень Хрысціны, Дашы і Ксюшы распісаны па хвіланах. Пад'ём у 7 гадзін раніцы, сняданак, зборы ў школу. Можна ўявіць, колькі часу і сіл патрабуецца, каб апрануць двух дзевяцігадовых малых, якія нічым не могуць дапамагчы. Пакуль дзяўчынкі на занятках, у Хрысціны ёсць тры гадзіны на свае справы. Пасля школы — заняткі з дэфектолагам ці заняткі фізкультурай. Свабоднага часу амаль не застаецца.

«Заняткі для дзяцей залежаць ад фінансаў бацькоў. Чым больш фінансаў — тым больш магчымасцяў. Я хацела б арганізаваць дзяўчынкам дадатковыя заняткі фізкультурай, дадатковыя заняткі з дэфектолагам. Вельмі хацела б наняць чалавека, які проста будзе гуляць з імі ў лялькі. У мяне на гэта фізічна няма часу, а самі без дапамогі яны не могуць. Таму ў раскладзе Дашы і Ксюшы няма звычайных дзіцячых гульняў», — адзначае Хрысціна.

Нягледзячы на тое, што Даша і Ксюша — двайняты, і паміж імі існуе вельмі моцная сувязь, характары ў іх абсалютна розныя. Даша — свавольная, у ёй шмат энергіі. Калі ёй неабходна нейкая цацка, яна будзе яе патрабаваць усімі сіламі. Падчас малявання яна камандуе, што і як рабіць. Хрысціна называе яе Агеньчыкам. А Ксюша — супрацьлегласць сястры. Яе мама называе «паненкай XVIII стагоддзя». Яна з нараджэння любіць паўздыхаць, часам гэта атрымліваецца ў тэму, «памахаць» вейкамі. «Мне варта павучыцца ў сваіх дзяцей. У адной — мяккай жаночай энергіі, у другой — дзейнасці і ўменню адстойваць сваё», — жартуе Хрысціна.



Трэба рухацца

Здароўе, настрой і развіццё дзяцей цалкам залежаць ад душэўных сіл іх бацькоў. На жаль, многія мамы, сутыкнуўшыся з цяжкім дзіцячым дыягназам, замыкаюцца ў сваёй бядзе. Хрысціна Жук і яе дзеці — адваротны і вельмі жыццесцвярджальны прыклад. «Усё залежыць ад характару мамы і ад таго, наколькі яна сыдзе ў свой боль. Я ведаю мам асаблівых дзетак, якія вядуць актыўны лад жыцця. Ёсць жанчыны, якія сыходзяць у сябе. Ім адназначна патрэбна псіхалагічная падтрымка. Я пэўны час працавала з псіхолагам, мне вельмі дапамагалі сябры. Я не заўсёды была такая моцная і пазітыўная, але побач знаходзіліся людзі, якія дапамаглі мне такой стаць. І патрэбна шукаць такіх людзей, не адмаўляцца ад іх дапамогі. Мама, у якой няма сіл і рэсурсу, не дапаможа сваім дзецям. Я стараюся пастаянна трымаць сябе ў бадзёрым настроі. Канешне, часам стамляюся, але што рабіць, трэба рухацца», — упэўнена Хрысціна.

Мама Дашы і Ксюшы не хавае, што ёй было цяжка. Асабліва ў першы год, які, па яе словах, прайшоў у стане «зомбі». Сон у чатыры гадзіны без перапынку быў марай. Цяпер прабле-

май стала фізічная стомленасць. Але Хрысціна кажа, што стараецца не дапускаць вялікай стомленасці, бо фізічны стан вельмі ўплывае і на эмацыянальны. Таму галоўная парада для ўсіх мам — клапаціцца аб сабе і шукаць тое, што зараджае пазітывам і сіламі.

«Нашы карціны зараджаюць і дзяўчынак, і мяне. Я вяду блог у інстаграме, і стасункі, абмен эмоцыямі з падпісчыкамі таксама даюць мне сілы. Я люблю даглядаць сябе, люблю масажы — гэта надае мне сілы. Часам у выхадныя, калі дзеці ўжо спяць, атрымліваецца выйсці патанцаваць з сяброўкамі. Тады я кардынальна пераключаюся. Мяне вельмі напаўняюць стасункі з цікавымі людзьмі, з сябрамі», — расказвае Хрысціна.

«Калі трэба расслабіцца, выплеснуць эмоцыі, зняць нейкія блокі — малюйце, што адчуваеце. Левай рукой ці правай, не задумваючыся — што адчуваеце, тое і малюйце!»

Універсальнага рэцэпту, як перажыць цяжкі перыяд, хваробу дзяцей, канешне, не існуе. Кожны праходзіць гэта сам. Хрысціна Жук дзеліцца сваім вопытам: «Мне здаецца, трэба даць сабе нейкі тэрмін, каб перажыць гэты боль і негатыўныя эмоцыі. Не варта ад гэтага бегчы. Неабходна гэта перажыць, паплакаць, пасумаваць. А калі ўстаноўлены тэрмін скончыцца — браць сябе ў рукі. Абавязкова знайсці свайго псіхолага, які дапаможа зрабіць першыя крокі. Будуць адкаты назад, у негатыў, у сум. Але трэба сябе выцягваць, шукаць пазітыўныя эмоцыі. Аптымізм павінен стаць галоўнай каштоўнасцю, якую трэба ў сабе развіваць. І неабходна пастаянна сачыць за эмацыянальным станам, знайсці заняткі, якія будуць кардынальна пераключаць ад мацярынства, заняткі для сябе. Калі канцэнтравацца толькі на хваробе, на складанасцях, то ніколі не выкараскаешся, а будзеш жыць у вечным стане ахвяры і закопваць сябе глыбей».

У марах, ці, дакладней, у планах Хрысціны, — прадставіць сваю выстаўку за мяжой. Гэта, канешне, вельмі складана. Але калісці і выстаўка ў «АртХаос» для яе была немагчымай... А ўвогуле, ці ёсць нешта немагчымае для Хрысціны і яе супердвайнятак?

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Аліны МАЗАВЕЦ і з асабістага архіва гераіні.

ТАТАЎ ПРЫКЛАД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Пачынаючы з 5-гадовага ўзросту дзеці ўжо могуць пераадольваць разам з татам розныя цяжкасці. Таму псіхолаг раіць далучаць іх да больш важных мужчынскіх спраў. Напрыклад, браць з сабой на рыбалку альбо ў паход з палаткамі. Прычым не мае значэння, хлопчык гэта ці дзяўчынка.

Пры гэтым вельмі важна, каб мама дзякавала тату за тое, што ён правёў час з дзіцем. А тата, у сваю чаргу, хваліў маму за тое, што тая робіць у яго адсутнасць. Гэта ўзаемная падмацоўка. Калі ў сям'і яе няма, то дзеці, падрастаючы, пачынаюць адмаўляць віды дзейнасці і заслугі кагосьці з бацькоў.

Некаторыя таты спрабуюць выхоўваць дзяцей словамі. Але гэта неэфектыўна, пераканана Людміла Губская. У дзіцячым узросце дзейнічае толькі прыклад. Тата павінен выступаць у ролі інструктара. Калі мужчына ўмее гуляць у футбол, ён навучыць гэтаму і свайго сына. Калі не, прывядзе свайго сябра, які ўмее гуляць у футбол — і гэта будзе раўнацэнна. Калі ж тата ляжыць на канапе і кажа: ну, ідзі зрабі тое ці тое — нічога не атрымаецца. Словамі нельга навучыць, словамі многае можна толькі сапсаваць.

Татаў прыклад важны як для дачкі, так і для сына. Праўда, тут розныя мэты. Для дзяўчынкі тата ў першую чаргу з'яўляецца прыкладам стаўлення да жанчыны. «Маленькія прынцэсы», якіх выхоўвалі ў любові, як правіла, будуюць сваё жыццё значна больш якасна. Дзяўчынка падсвядома выбірае будучага мужа, схільнага да тых паводзінскіх рэакцый, якія былі ў таты. Нават калі ўсведамляе, што той паводзіў сябе не вельмі правільна. Дарэчы, схему вырашэння канфліктаў як дачка, так і сын пераймаюць менавіта ад таты.

Хлопчыкі маюць патрэбу ў татавым прыкладзе ў большай ступені. Аднак тут ёсць пагроза навязвання стэрэатыпных сацыяльных усталёвак. Пра тое, што хлопчыкі не плачуць, церпяць, не скардзяцца, не абдымаюцца. Некаторыя лічаць, што выхоўваць будучага мужчыну трэба выключна ў строгасці, ніякіх пяшчоты і мяккасці. «Таты з такім перакананнем пацерпяць фіяска», — лічыць Людміла Губская і прыводзіць прыклад са сваёй практыкі.

Хлопчык займаецца з трэнерам вялікім тэнісам, і ў яго гэта няблага атрымліваецца.

Але тата, замест таго, каб заўважаць добрае, акцэнтуе ўвагу толькі на недахопах. Бясконца крытыкуе сына, на кожным кроку кажа: «Ты неарганізаваны, несабраны. Лётаеш у аблоках, таму ў цябе нічога не атрымліваецца». Проста чытаць натацыі, сварыцца, крытыкаваць — гэта шлях у нікуды. Пакуль маленькі, хлопчык церпіць. Калі ж падрасце — перакрэсліць усё, у тым ліку і тое добрае, што ў яго ўклаў тата. Ён будзе адмаўляць усе бацькавы прынцыпы выхавання. Гэта можа праяўляцца як у непаслухмянстве, так і ў супрацьпраўных дзеяннях. Мужчыны часта апраўдваюць сябе: «Мяне так выхоўвалі, і нічога — нармальным вырас». Але статыстыка, шматгадовыя даследаванні сведчаць пра іншае: калі тата быў жорскі ў адносінах да сына — у будучыні ў хлопчыка верагодней за ўсё праявяцца дэструктыўныя паводзіны.

І яшчэ цікавы момант. Першыя тры гады жыцця малечы стаўленне да таты фарміруецца толькі праз маму. «Нават калі тата ўзорны і ведае, як прывесці дзіця да здароўя, шчасця, поспеху, але ён выбраў сабе жанчыну, якая яго не цэніць, нічога не атрымаецца, — кажа дзіцячы псіхолаг. — Бо мама будзе ўвесь час адмаўляць татавы дасягненні. І гэта перадумова для парушэння паводзінаў дзіцяці, непаслухмянства. Як вынік, ламаецца схема перадачы татавага прыкладу. Разам з тым, нават калі мужчына вяртаецца з працы і ўвесь вечар сядзіць за камп'ютарам, дзіця будзе захапляецца татам — але толькі ў тым выпадку, калі мама задаволена сваім мужам».

Ад жанчын наогул залежыць вельмі многае. «Адна з іх ужо даўно развялася са сваім мужам, бо той моцна піў, — працягвае Людміла Губская. — Яны рассталіся вельмі канфліктна. Тым не менш мама не дэманізавала вобраз таты ў вачах сына. Пастаянна паўтарала: «У цябе цудоўны тата. Калі ты быў маленькі, ён да цябе вельмі цёпла ставіўся». І хлопец, нягледзячы на тое, што бацька не пацвярджае гэтых слоў, вырас годным чалавекам. Яму цяпер 21 год, ён добра вучыцца, у вольны час падпрацоўвае, мае добрых сяброў, прыгожыя адносіны з каханай дзяўчынай. У далейшым, думаю, яго чакаюць поспехі. Нават, нягледзячы на тое, што ён з бацькам практычна не падтрымлівае стасункі. Калі б мама дэманізавала вобраз таты, усё магло б скласціся зусім інакш».

Калі жанчына ў разводзе і тата не гарыць жаданнем займацца выхаваннем сына, псіхолаг раіць знайсці годнага мужчыну ў акружэнні, які б мог стаць для хлопчыка прыкладам для пераймання. Зараз на многія трэніроўкі можна першы раз прыйсці бясплатна. І пазнаёміцца з трэнерам. Калі ён мае мужчынскі тып характару, стрыманы, спакойны, пры гэтым любіць займацца з дзецьмі і захоўвае дыстанцыю, не спускаецца на іх узровень, то гэта будзе варты аб'ект для пераймання. І дзіця не адчувае, што побач няма татавага прыкладу.

Памятаеце, як у песні: «тата можа, тата можа ўсё, што заўгодна, толькі мамай, толькі мамай не можа быць». І наадварот. Таму што мама і тата, так задумана прыродай, павінны ўзаемадапаўняць адно аднаго. Але апошнім часам назіраецца небяспечная тэндэнцыя, калі мужчыны і жанчыны імкнуцца ўраўнавацца. Жанчыны рвуцца ў мужчынскі бізнес, мужчыны, наадварот імкнуцца да хатніх спраў, паняньчыць малых. «Калі муж на роўных з жонкай удзельнічае ў доглядзе дзіцяці — мяняе падгузкі, корміць, укладвае спаць — у сям'і з'яўляюцца дзве «мамы», якія выдатна замяняюць адна адну, — кажа Людміла Губская. — Няважна, што адна ў спадніцы, а другая ў штанах. Для дзіцяці гэта не вельмі добра, бо тым самым прыніжаецца статус таты».

«Некаторыя таты спрабуюць выхоўваць дзяцей словамі. Але гэта неэфектыўна. У дзіцячым узросце дзейнічае толькі прыклад».

Ну, а напрыканцы самае галоўнае, на мой погляд. Муж знаёмай працуе дома і цэлымі днямі сядзіць за камп'ютарам. Навушнікі не здымае нават падчас сумеснага абеду з сям'ёй. А потым скардзіцца, што сын практычна не выходзіць з пакоя — гуляе ў камп'ютарныя гульні. На прапанову таты ў выхадны дзень зрабіць разам шашлыкі ці пакідаць мяч у баскетбольнае кальцо, адказвае, што заняты.

...Тры гады таму пасля вяртання з рэдзільні я першай справай прычапіла да халадзільніка англійскую прымаўку: «Не выхоўвайце дзяцей — усё адно яны будуць падобныя да вас. Выхоўвайце сябе». Працаваць над сабой дзень за днём варта не толькі татам, але і мамам. Каб быць станоўчым прыкладам для сваіх дзетак. І пазбегнуць глабальных памылак, не даць ім перарасці ў снежны камяк, які ўжо не спыніць...

Надзея ДРЫНДРОЖЫК,
фота аўтара.

Дзіцячая кніга

ПРЫДУМАЦЬ СВОЙ «ХОД»

Кнігавыдаўцы няспынна падбіраюць новыя ключы да сэрцаў сваёй аўдыторыі. Але ўжо даўно нікога не здзівіш толькі добрым сюжэтам, яркімі ілюстрацыямі і цікавымі героямі. Таму выдавецтвы і пісьменнікі шукаюць і прыдумваюць свае хады, падыходы да чытача, каб сярод мноства прапаноў у кніжнай краме пакупнік абраў менавіта іх выданне. Вядомыя аўтары выдавецкага дома «Звязда» распавялі пра навіны і навінкі, што ў хуткім часе парадуюць дзяцей і іх бацькоў.

Фрагмент з кнігі «Як сябры човен будавалі»
Алены Стэльмах і Анатоля Мацвіенкі.

— Значнасць дзіцячай літаратуры складана пераацаніць. На кнігах для дзяцей выраслі ўсе дарослыя. Мы бачым, якая прыхільнасць у падрастаючага пакалення да інтэрнэта і гаджэтаў. Але ж менавіта кніга, чытанне і робяць асобу сапраўднай, — зазначае **пісьменніца, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ.** — Захапіць сучаснага юнага чытача нават самай яркай і прыгожай кнігай не заўсёды атрымліваецца. Трэба шукаць іншыя падыходы, спосабы ўздзеяння.

І тут кожны можа прыгадаць, якіх аўтараў і творы мы выбіраем сваім дзецям. Арыентуемся ці на ўласны густ, ці на рэкламу і водгукі знаёмых. Так, многім вядомая пісьменніца Кацярына Хадасевіч-Лісавая на кожнай сустрэчы з чытачамі ладзіць дзецям спатканне з героямі сваіх кніг. Такі падыход сапраўды спрацоўвае, каб абудзіць цікавасць. Маленькія чытачы хутчэй прыслухаюцца да казачных герояў, чым да дарослых.

Вельмі важна, каб у змесце кніг і ў іх героях заставаліся нязменныя акцэнты: што важна верыць у дабро; што ўменне бачыць незвычайнае ў звычайным выхоўвае ў нас людзей з жывым успрыманнем жыцця і здольнасцю мысліць нестандартна; што прыклады персанажаў могуць дапамагчы разабрацца ў саміх сабе і ў навакольным свеце. І галоўнае, каб чытач атрымліваў твор, напісаны якаснай мастацкай мовай.

Сёння ў Саюзе пісьменнікаў актыўна працуюць над тым, каб для дзіцячай аўдыторыі працягвала з'яўляцца літаратура па-беларуску ў фармаце аўдыякніг. Летась на Дні беларускага пісьменства «Белкніга» прэзентавала праект беларускіх аўтараў «Чытанка». Там можна знайсці і паслухаць аўдыякнігі як класікаў беларускай літаратуры, так і сучасных беларускіх аўтараў, што пішуць творы для дзяцей. Такі падыход, безумоўна, дае выбар чытачу. Аднак ці не хаваецца тут і пэўная небяспека, калі замест таго, каб пачытаць кнігу ў звычайным фармаце, мы проста «ўключаем» яе свайму дзіцяці для праслухоўвання...

— Што такое дзіцячая кніга? Яна патрабуе ад аўтара быць больш уважлівым, старанным, таму што дзіця — той чытач, якога ніяк не падманеш і нічым не падкупіш. Павінна быць толькі цікава, — кажа **пісьменніца Іна ФРАЛОВА.** — Тут згадвалі пра інтэрнэт, мабільныя тэлефоны і гэта зразумела, бо трэба ісці ў нагу з часам. Але калі будзе толькі электронная кніга, то мы страцім не толькі чытача, але і нешта самае галоўнае ў дзіцяці і ў чалавеку ўвогуле.

Прыемнай навіной для многіх стане і тое, што ў выніку супрацоўніцтва Саюза пісьменнікаў Беларусі і Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» у найбліжэйшы час распачнецца работа над стварэннем мультфільмаў па творах беларускіх дзіцячых аўтараў. Пяць літаратурных сюжэтаў атрымаюць новае ўвасабленне.

А ўвогуле, шукайце кнігі любімых аўтараў у кніжных крамах ці на сайтах выдавецтваў. І абавязкова чытайце ўсёй сям'ёй. Тады ў памяці застануцца не толькі героі і сюжэты, але і эмоцыі ад сумеснага адпачынку.

Алена ДРАПКО,
фота аўтара.

ЯНО ПРЫЙШЛО НЕСПАДЗЯВАНА...

Як дапамагчы свайму дзіцяці перажыць першае каханне?

Першы зуб, першы крок, першае слова, першы раз у першы клас, першае каханне — усё, што звязана са словам «першы», для бацькоў мае асаблівае значэнне і спалучана з хваляваннямі і перажываннямі. Сёння гаворым аб першым каханні — як паводзіць сябе бацькам і як дапамагчы свайму дзіцяці (і сябе) без страт перажыць гэта моцнае пачуццё.

У псіхалогіі няма дакладнага вызначэння, што ж такое першае каханне. Ці лічыць ім закаханасць у дзіцячым садку, або пад гэта вызначэнне падпадае толькі досыць дарослае пачуццё, якое ўзнікае ў падлеткавым узросце? Для мамы сын ці дачка яшчэ малыя, і раптам нечакана аказваецца, што дзіця закахалася. Як правіла, гэта выклікае ў бацькоў шок: яны не разумеюць, як ім сябе паводзіць.

— Самая галоўная парада — захоўваць спакой, — кажа **сямейны псіхолаг Кацярына ГАРЭЛЫШАВА.** — Не лезці дзіцяці ў душу і даць магчымасць «падсілкавацца» гэтым вопытам. І, зразумела, аказваць падтрымку, але толькі калі дзіця пра яе папросіць — захоча падзяліцца з вамі сваімі перажываннямі.

Трэба быць гатовым да таго, што першае каханне звычайна не праходзіць гладка: наадварот, яно звязана з перажываннямі і пакутамі. Псіхолагі кажуць аб тым, што першае, як правіла, няшчаснае менавіта таму, што гэта «прыступка ў дарослае жыццё», этап станаўлення асобы, які трэба прайсці кожнаму. Менавіта першае моцнае пачуццё дазваляе падлетку даведацца пра многія бакі сваёй асобы, пачаць разумець сябе лепш, прымераць новую, «дарослую» ролю. Але гэтая гісторыя абавязкова павінна мець заканчэнне, каб пакінуць юнаму чалавеку, які перажыў першае каханне, прастору для далейшага жыцця.

Дар'я, 36 гадоў:

«Калі мне было 14, я без памяці закахалася. Здарылася гэта летам у бабулі, у дачным пасёлку. У нас была крутая кампанія. Хлопчыкі выраблялі трукі на веліках, а дзяўчынкі ў кароткіх топіках, аблiпальных шортах і басаножках на платформе канкурыравалі за іх увагу. Мяне гадавалі «добрай дзяўчынкай». Я вырасла сціплай і цiхай, уборы ў мяне былі мілыя, але не модныя. Якая ўжо тут канкурэнцыя? І, зразумела, я закахалася ў самага файнага пацана. Ён быў старэйшы за мяне на паўтара года. Гэтыя адносіны не маглі быць жыццяздольнымі. Ён катаў мяне на раме ровара, мы хадзілі купацца і нават аднойчы цалаваліся. Але неяк вечарам я прыйшла на «наша месца», а ён цалуецца з іншай. Да гэтага часу памятаю адчуванне — як правальваецца сэрца... Цяпер разумею, што падабалася яму, але на ролю «сяброўкі лідара» не падыходзіла».

Формула кахання

У першага кахання ёсць спецыфіка, якую варта ўлічваць бацькам. Яно першае і гэта пачуццё не падобна ні на адно наступнае, якое чалавек перажывае ў жыцці. У прыватнасці, для першага кахання характэрна ідэалізацыя — узвядзенне каханага чалавека на п'едэстал. І не важна, старэйшы па ўзросце выбраннік (выбранніца) ці гэта проста аднакласнік (аднакласніца) — першая любоў схільная да ідэалізацыі. Асабліва калі каханне не ўзаемнае.

— Першае каханне па азначэнні здараецца ўпершыню. У падлетка яшчэ няма вопыту такіх стасункаў, ды і проста вопыту зносін пакуль наогул, а значыць, лёгка заблытацца, асабліва калі пачуцці «змятаюць усё на сваім шляху». Таму асабліва ўважлівымі трэба быць бацькам у выпадку, калі першае пачуццё ў падлетка ўзнікла да чалавека больш дарослага, бо ў іх розныя погляды і розныя мэты ў адносінах, — адзначае Кацярына.

Яшчэ адна асаблівасць першага кахання — зацыкленасць на сваіх перажываннях. Падлетак, па сутнасці, любіць не аб'ект сваіх пачуццяў, а свае пачуцці да гэтага чалавека. Моцныя эмоцыі неабходны нашай псіхіцы для правільнага развіцця, для сталення эмацыянальнай сферы, адзначае суразмоўца.

І, нарэшце, асаблівасцю першага кахання з'яўляецца замкнёнасць, нежаданне пускаць бацькоў у свае перажыванні. Сын ці дачка замыкаюцца ў сабе, хоць яшчэ нядаўна вам здавалася, што сакрэтаў ад вас у дзіцяці няма. Але бацькам у гэтай сітуацыі важна ўстрымацца ад надакучлівых роспытаў і парад, кажуць псіхолагі.

— Калі да гэтага моманту адносіны з дзіцём вы выбудоўвалі правільна, падлетак у рэшце рэшт абавязкова прыйдзе да вас па параду, — кажа псіхолаг. — Майце мудрасць і цярпенне, дачакайцеся гэтага моманту. Калі фарсіраваць падзеі, вы адштурхняце дзіця, і яно знойдзе сабе дарадцаў дзесьці яшчэ.

У каго ўлюбляюцца падлеткі? Часцей за ўсё, гэта людзі з іх асяроддзя — гэтак жа, як і ў дарослых.

— Каб прыняць рашэнне аб тым, ці пяройдзе мімалётная цікавасць да асобы супрацьлеглага полу ў фазу больш блізкіх адносін, кожнаму з нас патрэбны час. Камусьці дастаткова дзвюх сустрэч, камусьці трэба дзвесце, — кажа сексолаг Дзмітрый Капусцін.

Чалавека з блізкага асяроддзя — напрыклад, са свайго класа, школы, двара — падлетак бачыць у розных сітуацыях, можа ацаніць, як той (тая) паводзіць сябе ў розных абставінах, як рэагуе на пахвалу або крытыку, як ставіцца да чужых праблем — аказвае дапамогу ці ігнаруе. Важная і ацэнка гэтага чалавека навакольнымі. Усё гэта складнікі, з якіх нараджаецца пачуццё.

— А наогул, кажучы пра механізм прыцягнення, пачынаць варта яшчэ з унутрывантробнага перыяду: першым з пачуццяў у плода закладваецца нюх, — адзначае спецыяліст. — І менавіта нюх першым падсвядома падказвае, «наш» або «не наш» гэта чалавек, прыцягвае ён нас або выклікае непрыязнасць. Менавіта таму асабістыя адносіны не могуць параўнацца з анлайн-знаёмствамі.

Пагадзіцеся, першае каханне, «знойдзенае» вашым дзіцем не на прасторах інтэрнэту, а паблізу, усё ж больш бяспечнае. Так што можна толькі падзякаваць чалавечай прыродзе за тое, што і ў эпоху інфармацыйных тэхналогій асноўныя законы ўзнікнення прыцягнення паміж людзьмі не змяніліся.

Алеся, 45 гадоў:

«Першае каханне здарылася са мной у восьмым класе, у пачатку вучэбнага года. Такі быў прыгожы хлопчык! Улетку яго сям'я з'ехала ў іншы горад, а я засталася ў той жа школе, і ў нас было тры гады адносін на адлегласці: перапіскі, званкоў, кароткіх рэдкіх сустрэч. Аб гэтым можна было б напісаць раман! Напэўна, з-за таго, што мы амаль не бачыліся, мне было лёгка верыць у казку пра прынца, і маё першае каханне доўжылася столькі гадоў. Але я пераканалася, што кахання на адлегласці не бывае. Ён паступіў у ВНУ і пакахаў іншую — сваю аднагрупніцу. Сумная гісторыя атрымалася...

Аб чым важна памятаць

Дык што рабіць бацькам, якіх хвалюе першая закаханасць дзіцяці? Як дапамагчы падлетку? Псіхолагі кажуць: першае дарослае пачуццё для таго і даецца чалавеку, каб навучыць яго любіць. Праяўляць і прымаць каханне.

— Першае каханне вучыць не выбіраць «не тых» людзей. У таго, хто перажыў гэта, з'яўляецца магчымасць знайсці пазней «свайго» чалавека, з якім можна падзяліць жыццё, — кажа псіхолаг Кацярына Гарэлышава.

Асаблівасць першага кахання — права на памылку. У юнага чалавека. У бацькоў у гэтай сітуацыі права на памылку няма. Паводзіць сябе правільна вельмі важна, каб не страціць давер.

• Здолейце спакойна і добразычліва выслухаць падлетка, калі ён вырашыць расказаць вам пра свае любоўныя перажыванні. Не варта асуджаць яго выбар, калі выбраннік або выбранніца вам не па душы — нават калі вы перакананы, што гэты чалавек не варты пачуццяў і перажыванняў вашага сына або дачкі. Ні ў якім выпадку не трэба тут жа апавяшчаць усіх сваякоў аб тым, што адбылося. Будзьце тактоўныя. Бестактоўнасць адштурхне вашага падлетка.

• Устрымайцеся ад іранічных заўваг. «Глядзіце, Рамэа вышукаўся!», «Колькі яшчэ ў цябе будзе такіх Сяргееў!» — гэта зусім не тое, што хоча пачуць падлетак ад бацькоў у гэтай сітуацыі. Нават калі з вышыні пражытых гадоў усё гэта здаецца вам наіўным і смешным, лепш устрымацца ад смеху. Жарты, нявінныя і пацешныя на думку дарослых, могуць нанесці падлетку сур'ёзную псіхалагічную траўму.

Дзяніс, 37 гадоў:

«Першае каханне ў мяне было ў 13 гадоў. Гэта была дзяўчынка з суседняга двара. Некалькі месяцаў я не мог запрасіць яе на спатканне, але ўсё ж адважыўся. Мы пайшлі ў кіно, потым гулялі па вуліцах. Я праводзіў яе да кватэры. Дзверы адкрыў яе тата. Убачыў мяне і пажартаваў... не надта ўдала. Я кінуўся ўніз па лесвіцы. Больш да гэтай дзяўчынкі я не падыходзіў. Неўзабаве мы пераехалі ў іншы раён. Але я да гэтага часу ўспамінаю пра яе».

• Не варта думаць, што першае каханне не мае вялікага значэння. Для вашага сына ці дачкі гэта цяпер нашмат важней за ўсё астатняе. Таму фразы «Лепш бы вучыўся», «Справай займіся», «Думай не аб каханні, а аб паступленні» дадуць толькі адваротны эфект.

— Ставіцца да першага кахання несур'ёзна — вялікая памылка з боку бацькоў, — падкрэслівае псіхолаг.

Лепш дапамагчы парадай, прычым не «з вышыні свайго вопыту», а як бы вы параілі іншаму дарасламу, сябру або сяброўцы. Што надзець на спатканне, які букет падарыць дзяўчынцы, пра што размаўляць, куды пайсці і як сябе паводзіць — будзе лепш, калі гэта параіце вы, а не хтосьці чужы.

• Паважайце асабістую прастору дзіцяці. Не трэба капацца ў тэлефоне падлетка і падслухоўваць яго размовы. Не варта і забараняць адносіны, нават калі «мог бы і лепшую знайсці!». Гісторыя Рамэа і Джульеты даказвае: забароны толькі робяць прыцягненне мацнейшым. Лепш паспрабуйце ўспомніць сваё першае каханне і дазвольце свайму дзіцяці выпрабаваць усю палітру пачуццяў, якія яно дорыць. Галоўнае — будзьце побач, будзьце ўважлівыя і добразычлівыя. З часам эмоцыі ўлягуцца, і першае каханне застанецца ў душы вашага дзіцяці цёплым, хоць магчыма, і сумным успамінам.

Дзіяна РОНІНА.

ДЫМ З-ПАД КАПОТА...

24 студзеня гэтага года ратавальнікі Брэсцкага рэгіёна тушылі легкавы аўтамабіль «Мерседэс W211», 2002 г. в. у г. Століне. Агонь знішчыў багажны адсек машыны і пашкодзіў салон. У гэты ж дзень у в. Борысы Брэсцкага раёна полымя не пашкадавала аўтамабіль «Форд Эскорт», 1997 г. в. У дадзеным выпадку машына была знішчана агнём.

Гомельскім ратавальнікам прыйшлося двойчы выязджаць на тушэнне аўтамабіляў напярэдадні новага года, 21 снежня. У 09.51 паступіла паведамленне аб загаранні аўтамабіля «Fiat Scudo», 1998 г. в., на трасе Е-95 паблізу пасёлка Калініна Гомельскага раёна. Агонь пашкодзіў прыборную панэль і салон машыны. У гэты ж дзень у 19.31 ратавальнікам паступіў яшчэ адзін званок аб узгаранні машыны. Надзвычайная сітуацыя адбылася з аўтамабілем «Peugeot-406», 2002 г. в., у вёсцы Свяцілавічы Веткаўскага раёна. Агнём быў пашкоджаны маторны адсек.

Найбольш частыя прычыны ўзгарання аўтамабіляў — кароткае замыканне электраправодкі бартавой сеткі, курэнне ў салоне, уцечка паліва, масла і трапленне іх на разагрэтыя паверхні рухавіка, неасцярожнасць падчас правядзення электрагазазварачных работ, захоўванне ў багажніку сінтэтычных каністраў з бензінам (прыводзіць да назапашвання статыстычнай электрычнасці і выбуху).

Першыя прыкметы загарання — дым з-пад капота, пах бензіну, пах гарэлай гумы ў салоне. Калі дым ідзе з-пад капота, яго трэба адкрываць асцярожна, лепш збоку. Шырока раскрываць капот не варта — прыток кіслароду дасць агню разгарэцца. Калі капот заклініла ад тэмпературы, можна зрабіць шчыліну пры дапамозе манціроўкі ці падручных сродкаў.

Каб пазбегнуць загарання аўтамабіля, перш за ўсё сам уладальнік павінен паклапаціцца аб яго спраўнасці. Як? Своечасова ажыццяўляць рамонт і праходзіць тэхнічны агляд, а таксама ўкамплектаваць сваю машыну сродкамі пажаратушэння.

Калі загаранне аўтамабіля адбылося падчас руху, трэба адразу спыніцца. Уключыць аварыйку і высадзіць пасажыраў. Калі дзверы заклініла, выбіць шкло любымі падручнымі сродкамі. Скарыстацца вогнетушыцелем і паспрабаваць патушыць загаранне. Таксама можна выкарыстоўваць для тушэння шчыльную тканіну, брызент, пясок, снег. Калі вогнетушыцелю не ўдалося справіцца з агнём, лепш спыніць самастойнае тушэнне і, адышоўшы на бяспечную адлегласць, выклікаць ратавальнікаў па тэлефоне 101 ці 112.

Марыя ВАСІЛЕЎСКАЯ, галоўны спецыяліст Рэспубліканскага цэнтра прапаганды МНС.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению производственного унитарного предприятия «Гомельский завод металлоконструкций» ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Насонова В.В. извещает о проведении 17 февраля 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 25 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 310/С-38217** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **погрузо-разгрузочная площадка.** Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4/1. **Капитальное строение с инв. № 310/С-38218** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **погрузочная площадка.** Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4/2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000377** общей площадью **0,5901 га (право аренды). Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4. **Капитальное строение с инв. № 310/С-29449** общей площадью **10,0 кв. м,** назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – **кислородная.** Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4/7. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000373** общей площадью **0,0032 га (право аренды). Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4	**72 675,00**	3 633,75	7 267,50
2	**Капитальное строение с инв. № 310/С-38220** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **подкрановая эстакада.** Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4/3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000374** общей площадью **0,3200 га (право аренды). Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4. **Капитальное строение с инв. № 310/С-29451** общей площадью **105,4 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **гараж.** Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4/16. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000379** общей площадью **0,0523 га (право аренды). Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4	**43 950,00**	2 197,50	4 395,00

Продавец: унитарное предприятие «Гомельский завод металлоконструкций», г. Гомель, ул. Жарковского, 24, каб. 3-7.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.: 8 (029) 616-39-07 – главный инженер Леонид Петрович (осмотр недвижимости и территории), 8 (029) 835-67-42 – управляющий в деле о банкротстве Насонов Владимир Валерьевич, 8 (033) 634-86-95 – юрисконсульт Насонов Николай Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 3 февраля 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 15 февраля 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, возместить затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** с момента его подписания, **если иное не предусмотрено собранием (комитетом) кредиторов должника**. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.08.2021 г. № 157 (29526).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (044) 599-18-16, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛАРУСЬРЕЗИНОТЕХНИКА»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Беларусьрезинотехника»** (УНП 700069297), 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего Шпакова Олега Петровича.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019/6 в экономическом суде Могилевской области будут проведены **09 марта 2022 г. с 09.00 до 16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС	Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Автомобиль грузовой, бортовой тентовый, МАЗ 437041-221, 2005 г. в., темно-красный, кузов (рама) № Y3M437041150001151, рег. знак АІ 2554-6, инв. № 8564	6000,00	4200,00
2	Автомобиль грузовой, седельный тягач, МАЗ 543240, 2003 г. в., серый, кузов (рама) № Y3M54324030000981, рег. знак ТА 4778, инв. № 8549	7440,00	5208,00
3	Автомобиль грузовой, специальный, седельный тягач, МАЗ 5432 05-020, 2005 г. в., белый, кузов (рама) № Y3M54320550000948, рег. знак АІ 5246-6, инв. № 8565	8160,00	5712,00
4	Полуприцеп, платформа-тентовый, МТМ-933011, 2002 г.в., синий, кузов (рама) № шасси-Y3D933011120001652, рег. знак 3429 ТМ, инв. № 8535	4920,00	3444,00
5	Полуприцеп, МТМ-933011, 2000 г. в., синий, кузов (рама) № Y3D933011Y0001283, инв. № 8526, регистрационный знак 3940 ТМ	4560,00	3192,00

Местонахождение предметов торгов – Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, тел. для ознакомления +375 29 698-53-53

Для участия в торгах необходимо в срок с 04.02.2022 г. с 09.00 по 04.03.2022 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 календарных дней со дня завершения электронных торгов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет торгов в соответствии с условиями договора купли-продажи, но не позднее 30 календарных дней, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 22 февраля 2022 г. проводит повторный открытый аукцион № 02-У-22 с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены).
Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу. Повторный аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на земельном участке в г. Минске, предоставляемом в аренду сроком на 5 лет:

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб.	Наличие обременений	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб.
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	г. Минск, в границах просп. Независимости – Минская кольцевая автомобильная дорога – ул. Всехсвятских – кладбище «Восточное»	29,9825	Для строительства объекта «Застройка квартала в границах просп. Независимости – Минская кольцевая автомобильная дорога – ул. Всехсвятских – кладбище «Восточное»	1 736 548,92	347 300,00	38 082,72	Снос зданий и сооружений, попадающих под пятно застройки	23 447 680,99

Возмещение убытков производится лицами, которым предоставляются изымаемые земельные участки.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **22 февраля 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток не позднее 16 февраля 2022 г. в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № BY18AKBB36410000000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBB BY 2X, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона (его представитель), предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

